Сямейная газета

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

8 ЛЮТАГА 2018 г. ЧАЦВЕР № 27 (28643)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Рэцэпт пераадолення крызісу «сярэдняга ўзросту»



Калі жаночая калонія — не прысуд на ўсё жыццё



На дарогу выбег кот. Што рабіць кіроўцу?

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў:**

*«У 2017 годзе ў складанай абстаноўцы ў выніку сумесных намаганняў мы не толькі адстаялі, але і ўмацавалі ўжо заваяваныя міжнародныя пазіцыі. За Мінскам захоўваецца статус аднаго з цэнтраў рэгіянальнай палітыкі, пляцоўкі, на якой абмяркоўваюцца рэгіянальныя і сусветныя праблемы. Зусім не дзеля лаўраў, мы працягнем намаганні па гарантаванні бяспекі ў рэгіёне, будзем і далей забяспечваць пляцоўку для перагавораў, прасоўваць міратворчыя ініцыятывы, удзельнічаць у фарміраванні міжнароднага парадку дня на гэтым жыццёва важным напрамку».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 08.02.2018 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9886 | ▼ |
| Еўра | 2,4605 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0348 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0733 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Цёплы забег



Забег у валёнках правялі 7 лютага ў Мінску. Незвычайнае спаборніцтва было прымеркавана да дабрачыннага праекта «Зімовыя бегавыя гульні». Першыя 50 удзельнікаў, якія прайшлі рэгістрацыю, бясплатна атрымалі на старце валёнкі, якія маглі пакінуць сабе пасля фінішу.

Сабраныя пры падтрымцы Параалімпійскага камітэта Беларусі сродкі накіруюць Маладзечанскай спецыяльнай агульнаадукацыйнай школе-інтэрнату для дзяцей з парушэннямі зроку і Маладзечанскай санаторнай школе-інтэрнату для дзяцей, хворых на скаліёз. Грошы плануецца выдаткаваць на пераабсталяванне стадыёна і прыцягненне дзяцей з інваліднасцю ў параалімпійскі спорт.

**Ганна ЗАНКАВІЧ.**
**Фота аўтара.**

# УРАЧЫСТЫ МОМАНТ І ЗНАК ГАТОЎНАСЦІ

Учора адбылася цырымонія ўзняцця Дзяржаўнага сцяга Беларусі на XXIII зімовых Алімпійскіх гульнях

**Мерапрыемства ў алімпійскай вёсцы правёў яе мэр Сеун Мін Ру. У цырымоніі таксама прынялі ўдзел шэф беларускай місіі на Алімпійскіх гульнях намеснік міністра спорту і турызму Беларусі Аляксандр Бараўля, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў паўднёвай Карэі Андрэй Папкоў, а таксама спартсмены і трэнеры беларускай дэлегацыі.**





noc.by

Адзначым, што цырымонія ўзняцця дзяржаўных сцягоў — адно з найстаражытнейшых і найважнейшых сімвалічных мерапрыемстваў на Гульнях, яна папярэднічае афіцыйнаму адкрыццю кожнай Алімпіяды і сімвалізуе гатоўнасць алімпійцаў краіны да ўдзелу ў ёй.

СТАР. 2

■ Нам засталася спадчына

# САКРЭТЫ КВЕТАК І ТРАЎ

## Лячэнне народнымі сродкамі: гаючая сіла або эфект плацэба?

**Калісьці іншых лекаў, чым народныя, не было наогул. Цяпер зусім іншая справа. У аптэцы таблеткі і мікстуры на любы густ, былі б грошы. Купіў, выпіў і забыў пра хваробу. На крайні выпадак можна набыць нешта з травяных збораў ці настоек. Іх таксама ў продажы хапае. Усе правераныя і вывучаныя. Але, кажуць знаўцы ад народа, гэта не зусім адно і тое ж, што нарыхтаваў чалавек, які ведае сакрэты прыроды. На жаль, цяпер такіх людзей становіцца ўсё менш. Вёскі паміраюць, а моладзь мала цікавіцца бабулінымі рэцэптамі. Навошта ім гэта трэба? Афіцыйна, і гэта пацвердзілі ва ўпраўленні аховы здароўя Магілёўскага аблвыканкама, сённяшняй на тэрыторыі рэгіёна ніводнага траўніка няма. Але на вёсках яшчэ ведаюць, як карыстацца прыроднай аптэкай. Нашы суразмоўнікі траўнікамі сябе не лічаць, але тое-сёе пра лекавыя расліны ведаюць. Кажуць, што яны ім ратуюць жыццё і даюць сілы.**

### СРОДАК СУПРАЦЬ АСТМЫ

У Тамары Аксёнавай з вёскі Кабіна Гара Слаўгарадскага раёна дома цэлы аптэкарскі агарод. Тут табе і жывакост, і ісоп, і медуніца, і сінюха блакітная, і эхінацэя, і шалфей з чабаром, і іншыя карысныя травы і кветкі. На момант сустрэчы пенсіянерка змагалася з наступствамі нядаўняга грыпу. Прызнаецца, што захапленне травамі добра дапамагае ёй іх аблегчыць. Піць таблеткі прыйшлося, але ў якасці дапаможнага сродку ў ход ідуць зробленыя сваімі рукамі лекі.

СТАР. 4

■ Парламенцкі дзённік

# ХТО ЗАКАЗВАЕ МУЗЫКУ?

**Вялікая колькасць зваротаў грамадзян у Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці звязана з аўтарскім правам. Учора ахову інтэлектуальнай уласнасці абмеркавалі парламентарыі і эксперты на круглым стале на базе Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях.**

Зараз Пастаянная камісія Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы рыхтуе да разгляду ў першым чытанні законы, якія прадугледжваюць унясенне дапаўненняў і змяненняў у Закон «Аб аўтарскім праве і сумежных правах» і ў некаторыя законы па прававой ахове тапалогіі інтэгральных мікрасхем. **Аляксей БІЧУРЫН, начальнік Цэнтра па калектыўным кіраванні Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці,** растлумачыў некаторыя асаблівасці аховы аўтарскага права, а таксама расказаў пра вынікі 2017 года.

Так, у праекце закона прапануецца дапоўніць пералік выпадкаў свабоднага выкарыстання твораў у навучальных мэтах. Раней такая магчымасць не прадугледжвалася.

Да таго ж Аляксей Бічурын прыводзіць прыклад, што ў галіне фонавай музыкі — калі, напрыклад, у кафэ, рэстаранах ці на прадпрыемствах бытавога абслугоўвання гучаць мелодыі і песні — дзейнічае каля 600 дагавораў. Тым часам, паводле інфармацыі МАРГа, у нашай краіне дзейнічае як мінімум 50 тысяч аб'ектаў гандлю. У абсалютнай большасці з іх музыка ў той ці іншай форме гучыць, але, каб дайсці да ўсіх карыстальнікаў, патрэбны і час, і рэсурсы...

Як мінімум 800 аўтараў штомесяц атрымліваюць грошы за выкарыстанне іх творчасці. Летась было сабрана 5,2 млн рублёў аўтарскай платы на тэрыторыі Беларусі. 47 % ад іх прыходзяць ад вяшчання (тэле-, радыё- і інш.). Тым часам сектар гуказапісу і сучасных лічбавых тэхналогій значна не расце.

**Надзея АНІСОВІЧ**

■ Фінансы



# САКАВІК УЖО ХУТКА

## Час падаваць падатковую дэкларацыю

**Сёлета не пазней за 1 сакавіка трэба падаць у падатковыя органы дэкларацыю аб даходах за мінулы год. Тут варта адразу адзначыць, што далёка не ўсе абавязаны наведваць падатковую інспекцыю. Па-першае, дэкларацыі запаўняюць толькі падатковыя рэзідэнты нашай краіны. А гэта фізічныя асобы, якія фактычна знаходзіліся на тэрыторыі Беларусі больш за 183 дні ў каляндарным годзе. Па-другое, калі вы атрымлівалі даход з адной крыніцы, таксама можаце не турбавацца.**

**Якія даходы неабходна дэклараваць? Як атрымаць падатковую льготу? Ці плануецца пашыраць магчымасці электроннага дэкларавання даходаў? На гэтыя і іншыя пытанні адказваў эксперт — Андрэй КАВАЛЕЎСКІ, начальнік упраўлення падаткаабкладання даходаў і маёмасці фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах, падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА.**



Фота БЕЛТА.

### Дзве кватэры за пяць гадоў

Пакольк яшчэ ў 2009 годзе сукупнае дэклараванне было адменена, дэклараваць усе даходы не трэба, удакладняе Андрэй Кавалеўскі. Падаткаабкладанню ў падатковым органе падлягаюць толькі некаторыя віды даходаў. Напрыклад, атрыманыя ад грамадзян пры продажы другой і больш на працягу апошніх пяці гадоў кватэры, жылога дома, гаража, зямельнага ўчастка, садовага доміка. Пры гэтым дэкларацыя прадстаўляецца толькі пры аплатным адчужэнні двух аб'ектаў нерухомасці, якія адносяцца да аднаго віду (напрыклад, дзвюх кватэр, двух жылых дамоў і г. д.). Дэклараваць трэба і даходы ад продажу на працягу каляндарнага года другога і больш легкавога аўтамабіля, даходы ад продажу нежылых аб'ектаў (офісаў, гандлёвых памяшканняў). Таксама падлягаюць дэклараванню даходы, атрыманыя ад продажу на працягу каляндарнага года хоць бы аднаго аўтобуса (транспартнага сродку, колькасць месцаў у якім, акрамя кіроўцы, большая за восем) або аўтамабіля, тэхнічна дапушчальная агульная маса якога перавышае 3500 кг.

Прадставіць дэкларацыю абавязаны і тыя, хто, з'яўляючыся падатковым рэзідэнтам краіны, атрымліваў даходы за мяжой або з-за мяжы ў выглядзе заработнай платы або іншай аналагічнай узнагароды за выкананыя работы, аказаныя паслугі, выйгрышаў у анлайн-казіно, замежных букмекерскіх канторах, атрыманыя ад замежных аператараў рынку «Форэкс»... Стаўка падаходнага падатку адзіная ў дачыненні да ўсіх даходаў, няхай гэта будзе заработная плата, дывідэнды, даходы ад продажу маёмасці або іншыя, і складае 13 %.

### Упершыню ў электронным выглядзе

Дэкларацыя прадстаўляецца ў падатковы орган па месцы жыхарства не пазней за 1 сакавіка. Падатковы орган зробіць разлік падаходнага падатку і да 1 мая ўручыць паведамленне на яго выплату. Аплаціць падаходны падатак неабходна не пазней за 15 мая.

Бланк падатковай дэкларацыі размешчаны на афіцыйным сайце міністэрства nalog.gov.by, і пры неабходнасці яго можна раздрукаваць. Таксама бланк дэкларацыі можна вывесці на друк з даведачна-пошукавых сістэм альбо набыць у пунктах продажу «Белсаюздруку», размешчаных у памяшканнях падатковых органаў, або ў спецыялізаваных крамах.

Дэкларацыя можа быць прадстаўлена любым зручным для грамадзяніна спосабам: асабіста або праз упаўнаважаную асобу, па пошце, а таксама ў электронным выглядзе. Дарэчы, эксперт нагадаў, што з 1 студзеня гэтага года жыхары могуць запаўняць і прадстаўляць дэкларацыі ў электронным выглядзе праз асабісты кабінет плацельшчыка на партале міністэрства з дапамогай уліковага запісу і пароля без выкарыстання ключа электроннага лічбавага подпісу.

### Падатковы вылік

Прадставіць дэкларацыю аб атрыманых даходах могуць і грамадзяне, якія атрымлівалі ў 2017 годзе даходы не па месцы асноўнай работы (па дагаворах падраду) і маюць права на атрыманне падатковых ільгот у выглядзе стандартнага, сацыяльнага, маёмаснага або прафесійнага падатковага выліку.

Правы на сацыяльны падатковы вылік маюць плацельшчыкі, якія аплацілі навучанне (сваё ці блізкага сваяка) ва ўстанове адукацыі краіны пры атрыманні першай вышэйшай, першай сярэдняй спецыяльнай або першай прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Маёмасны вылік могуць атрымаць тыя, хто стаіць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў і меў выдаткі на набыццё або будаўніцтва жылля. Інакш кажучы, калі чалавек, які мае месца асноўнай працы, атрымлівае таксама даходы яшчэ недзе, то пры наяўнасці права на адпаведныя падатковыя вылікі ён можа звярнуцца па іх атрыманне ў падатковы орган. Для гэтага неабходна прадставіць падатковую дэкларацыю, пазначыць у ёй даходы, атрыманыя не па месцы асноўнай працы, а таксама прыкласці дакументы, якія пацвярджаюць права на падатковы вылік.

### Калі крыніца даходу невядомая

Андрэй Кавалеўскі адзначыў, што падатковымі органамі аналізуюцца даходы і маёмаснае становішча людзей. Па выніках аналізу выяўляюцца асобы, чые расходы значна перавышаюць афіцыйна атрыманыя імі даходы. У такіх асоб падатковыя органы патрабуюць дэкларацыі аб даходах і маёмасці.

Калі вызначана, што расходы грамадзяніна перавышаюць яго даходы, і прадстаўлены ім тлумачэнні не дазваляюць вызначыць крыніцу даходаў, за кошт якіх патрачаны такія сумы, то даходы такой асобы, вылічаныя падатковым органам зыходзячы з сум перавышэння расходаў над даходамі, падлягаюць падаткаабкладанню. Так, у 2017 годзе падатковымі органамі прааналізавана інфармацыя аб даходах і расходах каля 17 тысяч грамадзян. Больш за 3 тысячы з іх па патрабаванні падатковага органа не змаглі пацвердзіць крыніцы сваіх даходаў, зрасходаваных на набыццё маёмасці і на іншыя мэты, у сувязі з чым ім прад'яўлены да выплаты падаходны падатак на агульную суму 4,8 млн рублёў.

### Падаткі і штрафы

Калі тэрмін прадстаўлення дэкларацыі парушаны, то грамадзянін можа быць прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці ў выглядзе штрафу. Так, пры наяўнасці да выплаты сумы падатку і пратэрмінаванага прадстаўлення дэкларацыі больш чым на тры працоўныя дні штраф складзе ад дзвюх да дзесяці базавых велічынь (цяпер адна базавая велічыня — 24,5 рубля).

Такая ж адказнасць прадугледжаная, калі падатку да выплаты няма, але тэрмін прадстаўлення дэкларацыі парушаны больш чым на 12 месяцаў. Можа скласціся сітуацыя, калі дэкларацыя прадстаўлена своечасова, але падатак не выплачаны або выплачаны не ў поўным аб'ёме. Калі незаплачаная сума падатку перавышае базавую велічыню, штраф складзе 15 % ад гэтай сумы, але не менш за 0,5 базавай велічыні (гэта значыць не менш за 12,25 рубля).

Па выніках работы падатковых органаў за мінулы год 6370 грамадзян, якія своечасова не прадставілі падатковыя дэкларацыі і не выплацілі ва ўстаноўлены тэрмін падаходны падатак, былі прыцягнуты да падаткаабкладання. Сума падаткова прад'яўленага падатку склала 4,4 млн рублёў.

Праводзяцца праверкі ў дачыненні да фізічных асоб, якія ажыццяўляюць незарэгістраваную дзейнасць, а таксама асоб, чые расходы не адпавядаюць атрыманым даходам. У выпадку ўстанаўлення факта няпоўнай аплаты або нявыплаты падатку прымяняецца адміністрацыйная адказнасць. Разам з тым, калі вы ў першапачатковым варыянце дэкларацыі памыліліся і не цалкам пазначылі даходы, якія падлягаюць падаткаабкладанню, можна прадставіць удакладненую падатковую дэкларацыю і зрабіць даплату падаходнага падатку. Пры гэтым, калі ўдакладненая сума падатку будзе выплачаная не пазней за 15 мая, адміністрацыйная адказнасць не будзе прымяняцца.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Па-суседску

# НАРАСЦІЦЬ РЭЖЫМ ДАВЕРУ

**У Мінску знаходзіцца высокая дэлегацыя з Латвіі**

**Нашу краіну наведаў прэм'ер-міністр Латвійскай Рэспублікі Марыс Кучынкіс. Учора ён правёў сустрэчу як са сваім калегам Андрэем Кабяковым, прэм'ер-міністрам Беларусі, так і з кіраўніцтвам абедзвюх палат беларускага парламента.**

Па словах Міхаіла Мясніковіча, старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, Беларусь выступае за развіццё добрасуседскіх адносін, а таксама за напаўненне двухбаковага супрацоўніцтва новымі, канкрэтнымі праектамі. Беларускі бок задаволены актывізацыяй міжпарламенцкага супрацоўніцтва, падкрэсліў сенатар. Таксама асобным фактарам развіцця стасункаў для Латвіі можа стаць выхад праз нашу краіну на рынкі Еўразійскага эканамічнага саюза — Арменіі, Казахстана, Кыргызстана, Расіі. «Латвія магла б больш актыўна выкарыстоўваць магчымасці нашых двухбаковых адносін для таго, каб прасоўваць свае інтарэсы ў межах ЕАЭС», — адзначыў ён.

Пры гэтым важна, каб у гэтым кірунку працавала не толькі кіраўніцтва ведамстваў, але і профільныя камісіі, камітэты, міністэрствы. «Так мы можам нарошчваць рэжым даверу. Мы часам сароміемся пра гэта казаць, — адзначыў спікер верхняй палаты беларускага парламента, — але гэта такая рэч, якая пастаянна патрабуе кантактаў, абмеркавання. Тады і фарміруецца добры клімат, сама атмасфера». Варта таксама звярнуць увагу на міграцыйную палітыку, пытанні наркатрафіка, пагранічнай інфраструктуры, гуманітарную сферу, супрацоўніцтва ў міжнародных арганізацыях, а таксама ў гандлёва-эканамічным плане — на работу паміж беларускімі і латвійскімі рэгіёнамі з інвестарамі з трэціх краін.

У сваю чаргу Марыс Кучынкіс заклікаў рабіць зрухі ў развіцці двухбаковага супрацоўніцтва. Па яго словах, ён бачыць шмат пунктаў, у якіх нам яшчэ належыць зрабіць крокі наперад.

* * *

Латвійскі прэм'ер правёў таксама сустрэчу з Андрэем Кабяковым. У канцы перагавораў падпісана Пагадненне паміж урадамі Беларусі і Латвіі аб раннім апавяшчэнні пра ядзерныя аварыі, абмен інфармацыяй і супрацоўніцтва ў сферы ядзернай бяспекі і радыяцыйнай абароны.

**Вераніка ПУСТАВІТ**

# УРАЧЫСТЫ МОМАНТ...

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

*«Гэтая цырымонія пазначае, што Алімпіяда ўжо зусім блізка, мы тут разам усе ў зборы, у добрым настроі, гэта ўсё ўрачыста. Бачачы, як падымаецца наш сцяг, мы адчуваем падтрымку ўсёй краіны»,* — падзялілася сваімі ўражаннямі **Дар'я Домрачава.**

*«Калі сцяг падымаецца, заўсёды для мяне гэта ўрачысты момант, ёсць патрыятычныя пачуцці, «мурашкі» заўсёды па целе бягуць»,* — адзначыў **Сяргей Далідовіч.**

Нагадаем, што заўтра ў 14.00 па беларускім часе адбудзецца цырымонія адкрыцця Алімпіяды-2018 у Паўднёвай Карэі. Парад краін-удзельніц традыцыйна адкрыюць грэкі, а астатнія зборныя пройдуць па алімпійскім стадыёне ў алфавітным парадку (на карэйскай мове). Апошнімі перад гледачамі з'явяцца паўночнакарэйскія і паўднёвакарэйскія спартсмены.

Дарэчы, напярэдадні Міжнародны Алімпійскі камітэт пазбавіў права паказваць шоу адкрыцця агенцтва Reuters за тое, што яны выклалі ў інтэрнэт фота з рэпетыцый запальвання алімпійскага агню.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

❍ У тэму

**Сцяг Беларусі на цырымоніі адкрыцця Алімпійскіх гульняў панясе Ала ЦУПЕР. Фрыстайлістка, алімпійская чэмпіёнка Сочы-2014, была абраная сцяганосцам на агульным сходзе беларускіх алімпійцаў у Пхёнчхане.**

«10 лютага пачнуцца спаборніцтвы па біятлоне, лыжных гонках, шорт-трэку і канькабежным спорце. Мы выходзілі з таго, каб не парушыць графік падрыхтоўкі спартсменаў да найважнейшых стартаў чатырохгоддзя, — падкрэсліў **шэф місіі Аляксандр Бараўля.** — Да таго ж сцяганосцам павінен быць дасведчаны, знакаміты і вядомы атлет. У Алы Цупер усё гэта ёсць. Ды і, як вядома, спартсменка збіраецца пазмагацца за медаль на Гульнях у Пхёнчхане. Таму вырашана было даверыць гэтую місію ёй. На наш погляд, з усіх бакоў годны выбар».

Адзначым, што за апошнiя дзесяцігоддзе сцяг беларускай дэлегацыі на Алімпійскіх гульнях неслі: хакеіст Алег Антоненка (Ванкувер-2010), тэнісіст Максім Мірны (Лондан-2012), фрыстайліст Аляксей Грышын (Сочы-2014), прадстаўнік кулявой стральбы Сяргей Мартынаў (Рыа-2016).

■ Тэхналогіі

# ІНТЭРНЭТ-РЭСУРС СУПРАЦЬ ДАЎГОЎ

## Своечасова разлічвацца па рахунках дапаможа сайт

**Паводле звестак Белстата, да канца 2016 года сукупная крэдыторская запазычанасць айчынных прадпрыемстваў склала каля 39,6 мільярда рублёў, а дэбіторская знаходзіцца на ўзроўні 29,9 мільярда рублёў. У сваю чаргу, пратэрмінаваныя крэдыторскія і дэбіторскія запазычанасці, якія практычна роўныя, складаюць каля 6,85 мільярда рублёў. Досыць круглая сума ляжыць мёртвым грузам у бухгалтарскіх справаздачах і не працуе ў эканоміцы. Але ўжо з'явіўся новы падыход, які дазволіць разабрацца з даўгавымі ланцужкамі. Унікальная інтэрнэт-платформа www.dolgovnet.by, якая можа стварыць умовы для фінансавага аздараўлення прадпрыемстваў, ужо ў працы. Карэспандэнт «Звязды» пагутарыў з адным са стваральнікаў прарыўнога праекта Ігарам МАЦКЕВІЧАМ, які і расказаў сутнасць яго дзеяння.**

### АНТЫПАЗЫКОВЫ АЛГАРЫТМ

Працаваць па-старому ў эру лічбавых тэхналогій азначае безнадзейна адстаць ад усяго свету. Многія гэта бачаць, але не ўсе разумеюць, як рэалізаваць. У краіне ёсць і тыя людзі, якія глядзяць на свет з іншага ракурсу і бачаць часам тое, што не ўсім даступна. Стваральнікі рэсурсу www.dolgovnet.by пабудавалі тую сістэму, якая выдатна можа справіцца з даўгавымі праблемамі нашых прадпрыемстваў. Менавіта таму прадстаўнікі дзяржаўных структур ужо далі станоўчую ацэнку праекту, бо аналагаў рэсурсу сёння ні ў дзяржаве, ні ў блізкім замежжы няма. Як расказаў Ігар Мацкевіч, уся справа ва ўнікальным алгарытме, з дапамогай якога працуе сайт, — у прамым сэнсе новае тэхналагічнае рашэнне. Інтэрнэт-платформа будзе спрыяць таму, каб прадпрыемства хутчэй разлічвалася з даўгамі і думала пра развіццё, мадэрнізацыю, прыцягненне высокакваліфікаваных спецыялістаў. «Для прыватных і дзяржаўных кампаній не трэба будзе нават разглядаць варыянт, пры якім несвоечасова выплачваць даўгі выгадна. Бо некаторыя за кошт інфляцыйных і дэвальвацыйных працэсаў змяншалі колькасць тых грошай, якія трэба вярнуць. Гэта становіцца менш актуальным сёння. Суб'екты гаспадарання ўсё больш зацікаўлены ў хуткім разліку з даўгамі і аздараўленні свайго фінансавага стану», — тлумачыць Ігар Мацкевіч.

Паводле яго слоў, дадзены рэсурс з'яўляецца лагічным працягам таго, у чым маюць патрэбу шматлікія буйныя кампаніі ў краіне. «На пачатковай стадыі распрацоўкі мы кансультаваліся з Міністэрствам па падатках і зборах, з Нацыянальным банкам. Мы дэманстравалі свае ідэі і атрымалі станоўчы водгук. Работа рэсурсу ўпісваецца ва ўсе заканадаўчыя рамкі, а па частцы біржы па продажы даўгоў ён нават з'яўляецца практычнай рэалізацыяй Указа Прэзідэнта № 154 «Аб фінансаванні камерцыйных арганізацый пад уступку правоў (патрабаванняў)», — дадаў Ігар Мацкевіч.

### ЯК ГЭТА ПРАЦУЕ?

Прынцып работы рэсурсу заключаецца ў тым, што пасля рэгістрацыі на сайце www.dolgovnet.by карыстальнік (гэта можа рабіць як юрыдычная, так і фізічная асоба) размяшчае інфармацыю аб сваёй крэдыторскай або дэбіторскай запазычанасці. Далей на сайце апрацоўваюцца мільёны такіх запісаў у наяўнай базе даных і фарміруюцца замкнёныя ланцужкі з усіх блізкіх крэдытораў і даўжнікоў. Калі ўсе ўдзельнікі ланцужка бачаць адзін аднаго, становіцца больш зразумела, «хто, каму і колькі». Такая інфармацыя можа быць выкарыстана для спісання доўгу без прыцягнення дадатковага фінансавання. Акрамя таго, у прадпрыемстваў з'яўляецца магчымасць прадаць дэбіторскі доўг і атрымаць за яго рэальныя грошы, каб пусціць іх у абарот.

«Матэматычны алгарытм, які ляжыць у аснове работы рэсурсу, дазволіць пазбавіць беларускія кампаніі ад лішніх і затратных судовых разбораў. Варта адзначыць, што аналагічная практыка праводзілася яшчэ ў часы СССР у выглядзе усесаюзных залікаў міністэрствамі і буйнымі трэстамі. Але там усё рабілі ўручную. У нас дастаткова зрабіць пару клікаў», — расказаў распрацоўшчык праекта.

Пасля таго як бакі знайшлі агульны інтарэс у тым, каб вырашыць свае пытанні, за працу бяруцца юрысты. «Нам удалося аўтаматызаваць практычна ўсё, акрамя юрыдычнай падтрымкі, якая ў такіх аперацыях мае вялікае значэнне», — адзначыў Ігар Мацкевіч. Але, па яго словах, гэта таксама цалкам рэальная задача. У сувязі з гэтым праекту трэба трапіць пад праграму Парка высокіх тэхналогій. Так працу юрыстаў змогуць замяніць смарт-кантактамі, працэс перадачы доўгу — токенамі. Усё гэта яшчэ больш аптымізуе працу з рэсурсам.

Стваральнікі сайта не плануюць спыняцца на рабоце толькі ў Беларусі. У іх планах таксама выйсці на рынкі постсавецкай прасторы, дзе існуюць праблемы неплацяжоў. Нізкі кошт сэрвісу, які разлічваецца па адзіным тарыфе для ўсіх і дзе кліент плаціць толькі за атрыманне канкрэтнай інфармацыі аб крэдыторах, прадаўцах даўгоў, павінен зацікавіць многіх. Акрамя таго, праца ў рэсурсе не нясе ніякіх рызык. А вось карысць істотная: уласнік можа аб'ектыўна ацэньваць фінансавыя вынікі гаспадарчай дзейнасці. «Мы ўжо працуем над тым, каб укараніць сістэму ацэнкі ліквіднасці даўгоў, — гаворыць Ігар Мацкевіч. — Гэта дазволіць фармаваць рэйтынгі, што паспрые разуменню свайго фінансавага становішча».

Ілья КРЫЖЭВІЧ

■

■ Страта

# ПАМЁР ГЕНАДЗЬ ГАРБУК



Як паведамілі ўчора вечарам у Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы, пайшоў з жыцця Генадзь Гарбук, народны артыст Беларусі. Яму было 83 гады. Мастацтву народнага артыста быў уласцівы моцны тэмперамент, глыбокае псіхалагічнае спасціжэнне характараў. Майстар яркай сцэнічнай дэталі, гратэску. Створаныя Гарбуком вобразы адметныя павышанай драматычнай напружанасцю, эмацыянальнасцю, глыбокім псіхалагічным разуменнем характараў. Ён быў добра вядомы гледачу па тэатральных пастаноўках у ролях Васіля (спектакль і тэлевізійная пастаноўка «Людзі на балоце» паводле І. Мележа, за тэлеверсію Дзяржаўная прэмія БССР 1966 года, Сымона («Раскіданае гняздо» Я. Купалы), Зёлкіна («Хто смяецца апошнім» К. Крапівы), Яўменя («Ажаніцца — не журыцца» М. Чарота і Далецкіх), Клёпкіна, Прокусава («Пагарэльцы», «Верачка» А. Макаёнка), Андрэя Буслая («Парог» А. Дударава) і многіх іншых.

Генадзь Міхайлавіч стварыў яркія вобразы ў фільмах «Людзі на балоце», «Белыя росы», «Раскіданае гняздо», «Чорны замак Альшанскі», «Трэцяе пакаленне», «Ваўчыная зграя» і многіх іншых.

Пра час і месца пахавання артыста стане вядома ў найбліжэйшы час.

Светлая памяць...

■ Грошы

# У студзені золатавалютныя рэзервы склалі каля 6,5 млрд долараў

**Золатавалютныя рэзервы Беларусі па стане на 1 лютага, паводле папярэдніх даных, склалі 6,477 млрд долараў у эквіваленце, паведамляе прэс-служба Нацыянальнага банка краіны.**

За студзень 2018 года золатавалютныя рэзервы знізіліся на 837,9 млн (на 11,5 %) долараў. «Зніжэнне ўзроўню міжнародных рэзервовых актываў па выніках студзеня абумоўлена планавым пагашэннем урадам і Нацыянальным банкам Беларусі знешніх і ўнутраных абавязацельстваў у замежнай валюце на агульную суму каля 1,4 млрд долараў, з якіх 835,8 млн долараў склалі абавязацельствы краіны па дзяржаўных аблігацыях, размешчаных на міжнародным фінансавым рынку», — растлумачылі ў Нацбанку.

Падтрыманню ўзроўню золатавалютных рэзерваў у студзені спрыялі пастудленне замежнай валюты ў бюджэт, у тым ліку ад збірання экспартных пошлін на нафту і нафтапрадукты, пастудленне сродкаў ад продажу Нацыянальным банкам і Міністэрствам фінансаў аблігацый, намінаваных у замежнай валюце. Станоўчы ўплыў на ўзровень рэзерваў таксама аказала павелічэнне кошту манетарнага золата. За 2017 год золатавалютныя рэзервы Беларусі ў вызначэнні МВФ павялічыліся на 2,4 млрд (на 48,5 %) долараў да 7,315 млрд долараў у эквіваленце.

Сяргей КУРКАЧ

■

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### МАКЕДОНІЯ ЗАЯВІЛА ПРА ГАТОЎНАСЦЬ ПЕРАЙМЕНАВАЦЦА

**Прэм'ер-міністр гэтай балканскай рэспублікі Зоран Заеў заявіў, што Македонія гатовая змяніць сваю афіцыйную назву, каб спыніць канфлікт з Грэцыяй, які зацягнуўся. Пра гэта паведамляе Reuters.**

Македонія і Грэцыя вядуць працяглую спрэчку з-за назвы першай. Грэцыя дамагаецца змены назвы рэспублікі, каб яе не блыталі з грэчаскай вобласцю Македонія.

«Я хачу, каб перагаворы з Грэцыяй прайшлі паспяхова. Мы гатовы ўнесці ўдакладненне ў геаграфічнае найменне», — сказаў Заеў. Агенцтва адзначае, што дыпламаты абедзвюх краін бачаць у якасці прымальных назвы Паўночная Македонія, Новая Македонія або Верхняя Македонія.

Раней паведамлялася, што Македонія хоча выбраць новую назву краіны на рэферэндуме.

### ТРАМП ПАПРАСІЎ ПЕНТАГОН СПЛАНАВАЦЬ ВАЕННЫ ПАРАД У ВАШЫНГТОНЕ

**Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп натхніўся ваенным парадам у Парыжы на Елісейскіх палях 14 ліпеня і вырашыў зладзіць такі ж у сваёй краіне, але аформіў сваё жаданне ў выглядзе даручэння вайскоўцам толькі цяпер, паведамляюць амерыканскія СМІ.**

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп звярнуўся да міністэрства абароны з просьбай прапанаваць план «грандыёзнага» парада ў Вашынгтоне ў 2018 годзе, каб адсвяткаваць «ваенную сілу» краіны. Пра гэта паведамляе Associated Press са спасылкай на прэс-сакратара Белага дома Сару Сандэрс.

Па словах Сандэрс, Трамп хоча, каб Пентагон «разгледзеў магчымасць правядзення свята», якое дазволіць амерыканцам «праявіць падзяку ваенным». Прадстаўнік Пентагона Чарлі Самэрс таксама заявіў, што чыноўнікі ў мінабароны ЗША ведаюць аб запыце Трампа і «разглядаюць варыянты» правядзення парада.

Associated Press адзначае, што «праявы ваеннай сілы» падчас ваенных парадаў не ўласцівыя амерыканскім ваенным, «у адрозненне ад такіх краін, як Кітай і КНДР». «Амерыканскія ваенныя звычайна ўдзельнічаюць у парадзе 4 ліпеня, каб ушанаваць памяць ветэранаў вайны, але звычайна ў яго не ўваходзіць дэманстрацыя ваеннай тэхнікі», — адзначае агенцтва.

«Загад быў такі: я хачу парад, як у Францыі, — сказала адна з крыніц Washington Post у ваенным ведамстве. — Пытанне прапрацоўваецца на вышэйшых узроўнях Пентагона».

### САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫ ФРГ І БЛОК МЕРКЕЛЬ УЗГАДНІЛІ АСНОЎНЫЯ ПАЛАЖЭННІ КААЛІЦЫЙНАГА ДАГАВОРА



**Сацыял-дэмакратычная партыя Германіі (СДПГ) і кансерватыўны блок Хрысціянска-дэмакратычнага і Хрысціянска-сацыяльнага саюзаў (ХДС/ХСС) у аўторак на перагаворах аб фарміраванні ўрада ФРГ узгаднілі асноўныя палажэнні будучага кааліцыйнага дагавора. Яго праект апублікавала газета Rheinische Post.**

Новы германскі ўрад нацэлены на нармалізацыю адносін з Расіяй і вяртанне ўзаемнага даверу.

«Мэтай нашай палітыкі з Расіяй застаецца вяртанне да адносін, якія базіруюцца на ўзаемным даверы і балансе інтарэсаў і якія дазволяць вярнуцца да цеснага партнёрства», — адзначаецца ў дакуменце. Будучая кааліцыя лічыць таксама па-ранейшаму актуальнай ідэю стварэння агульнай эканамічнай прасторы ад Уладзівастока да Лісабона і падкрэслівае сваю зацікаўленасць у «добрых адносінах з Расіяй і цесным супрацоўніцтве для забеспячэння міру і ўрэгулявання сур'ёзных міжнародных выклікаў».

# Адкуль каменьчыкі і золата?

## Туркмены спрабавалі збыць ювелірку

**Праваахоўнікі затрымалі грамадзян Туркменістана, якія спрабавалі прадаваць у Мінску брыльянты і залатыя ювелірныя вырабы.**





Па падазрэнні ў парушэнні правілаў аб здзелках з каштоўнымі металамі і камянямі аператыўнікамі УБЭЗ ГУУС, Фрунзенскага РУУС затрыманы два родныя браты — грамадзяне Туркменістана. Замежнікі, 26 і 36 гадоў, навучаюцца завочна ў ВНУ ў Гродне, прыехалі на сесію. Акрамя навучання яны планавалі ў Мінску прадаваць брыльянты і ювелірныя вырабы, якія прывезлі з сабой з Туркменістана і на якія не мелі дазволу Дзяржаўнай інспекцыі прабірнага нагляду Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь. Аб планах замежных гасцей у падраздзяленні БЭЗ паступіла аператыўная інфармацыя. Затрыманы мужчыны былі на вуліцы Прытыцкага з доказамі злачынства ў момант продажу дзесяці брыльянтаў. За такую колькасць каштоўных камянёў яны хацелі атрымаць 950 долараў.

У ходзе правядзення вобыскаў аператыўнікі знайшлі і канфіскавалі залатыя ювелірныя вырабы з дыяментамі і ізумрудамі, чатыры пакеты з камянямі жоўтага і белага колераў, як мяркуецца, залатыя вырабы, злітак з металу жоўтага колеру. Зараз праводзяцца даследаванні ўсіх канфіскаваных каштоўнасцяў, аператыўнікі высвятляюць, дзе мужчыны іх набылі, і іншыя падрабязнасці. Заведзена крымінальная справа.

Сяргей РАСОЛЬКА.

# САКРЭТЫ КВЕТАК І ТРАЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Жанчыне крыху за 60, але травамі яна зацікавілася яшчэ калі не было і 30. Яна тады вельмі пакутавала на алергічную астму.

— Працавала спачатку ў швейным цэху, потым у вязальным — вельмі пыльная вытворчасць, нам нават за шкоднасць плацілі, — кажа яна. — Ды яшчэ скразнякі пастаянныя. Спачатку ангіны замучалі. Тэмпературы не было, бальнічны не давалі — хварэла на нагах. Антыбіётыкаў перапіла столькі, што страшна падумаць. У выніку падарвала імунную сістэму і займела алергічную астму. Была страшная рэакцыя на хатні пыл. Пакутавала, не тое слова. Задыхалася ад недахопу паветра. Хапаеш яго ротам, а яно не ўдыхаецца. Пачала ездзіць па санаторыях і прафілакторыях, аднойчы пазнаёмілася з жанчынай, якая вельмі падарвала сваё здароўе ў Асвенціме. Расказвала, што выратавалася толькі дзякуючы народным рэцэптам. Мяне гэта ўсё вельмі зацікавіла, стала шукаць рэцэпты ў бібліятэцы, ездзіла да сяброўак на летнікі, збірала карысныя расліны. У доме пастаянна былі чабор, ісоп. І — інгалятары. Праўда, яны ўсё радзей і радзей патрабаваліся. Працэдуры ў бальніцы, травы — усё ў комплексе дапамагло пазбавіцца ад астмы.



Жанчына з таго часу без траў не абыходзіцца. У яе аптэцы настойкі жывакосту, шабельніку, настоеныя на гарэлцы бярозавыя пупышкі і кветкі белага бэзу. Раней, калі старэйшая сястра жыла на Камчатцы, яна забяспечвала Тамару Аляксандраўну яшчэ і ружовай радыёлай. Гэта расліна нешта накшталт жэньшэню, падымае тонус. Зараз пенсіянерка спрабуе вырошчваць яе у тутэйшых умовах. Пашчасціла неяк купіць на рынку.

А вось лепшага сродку, чым шалфей, ад прастуды няма. «Гэта я па сабе добра ведаю, — кажа суразмоўніца. — У маладосці ў мяне была гнойная ангіна і я паласкала горла шалфеем кожныя дзве гадзіны. Праз тры дні ад хваробы і следу не засталося. З таго часу ўсім раю шалфей. Як толькі ў горле запяршыла, заварвайце чайную лыжку травы шклянкай даведзенай да «белага ключа» гарачай вады (яна павінна заставацца жывой, нельга, каб перакіпала) і палашчыце». З дапамогай настойкі шабельніку жанчына лечыць суставы. Раніцай і вечарам націрае балючае месца і ўцяпляе. Жывакост дапамагае пры хваробах страўніка, сінюха блакітная — добры заспакаяльны сродак. «Яна яшчэ лепш дапамагае, чым сардэчнік або валяр'ян», — удакладняе жанчына. Прыгадвае, што пэўны час нармалізавала нізкі крывяны ціск з дапамогай настойкі заманіхі. «Пах — немагчыма вытрымаць, а тым больш піць, але хутка разумееш — добра дапамагае», — кажа яна. Змагацца з нізкім ціскам дапамагаюць радыёла ружовая, жэньшэнь, элеўтэракок.

А яшчэ лепш уплывае на здароўе вясковы лад жыцця, прыгожыя пейзажы. Таму акрамя карысных раслін Тамара Аксёнава вырошчвае ў сябе на ўчастку і экзоты. Летам выйшаў у агарод, сядзі і любуйся. Кабея, бамія, жоўтыя агуркі, рознакаляровая радыска, фіялетавая спаржавая фасоля, дэкаратыўная капуста — чаго тут толькі няма. Тамара Аляксандраўна спрабуе размножыць на сваім участку журавіны, дурніцы канадскія, брусніцы.

А ў доме яшчэ адзін агарод. У спальні Тамары Аляксандраўны чысціць паветра ядловец, у зале стаяць вазоны з індыйскай цыбуляй, з якой яна робіць націранні, каланхоэ — ад ангіны, лекавыя цыкламен, размарын. Без таблетак у сталым узросце, канешне, не абысціся, але расліны дапамагаюць імі не злоўжываць, упэўнена жанчына.

## ЦЁТЧЫНЫ РЭЦЭПТЫ

Калісьці на Слаўгарадчыне жыла добра вядомая нават за межамі вобласці траўніца Ганна Аксёненка. Некалькі гадоў таму, на жаль, яе не стала, але навуку пераняў пляменнік Міхаіл Гутараў.

Ён успамінае, што ў цёткі нават была нейкая старадаўняя рукапісная кніга пра лекавыя расліны, перадавалася па жаночай лініі. Цяпер яна ў яе дачкі ў Эстоніі. Асабліва цікавіцца лекавымі травамі цётка Ганна пачала пасля таго, як моцна захварэла. Быў перыяд, калі яна з бальніц не выходзіла, а лепш не станавілася. Вось тады жанчына і ўспамінала пра свае спадчынныя запісы.



— Я добра памятаю той час, — кажа Міхаіл. — Сам суправаджаў яе ў лясныя паходы. Ідзём, а яна па дарозе расказвае, гэта трава ад таго, а вунь тая ад гэтага. А я запамінаў. Вось вы ведаеце, што плакучая таполя лепш за ўсякі ёд раны загойвае? Ранняй вясной, яшчэ да таго як яна распусцілася, на ёй утвараецца слізкая мякаць. Яе трэба сабраць шклянку і заліць літрам гарэлкі. Любыя драпіны імгненна зажываюць.

Сродкам № 1 у дамашняй аптэцы Ганны Аксёненкі быў грыб вясёлка. «Яна мне і месцы паказала, дзе ён расце, — расказвае суразмоўнік. — Потым я яшчэ і іншыя знайшоў. Самае каштоўнае, гэта грыбныя «яйкі». Шэсць штук заліваюць трыма літрамі гарэлкі, ставяць у цёмнае прахалоднае месца, і цераз месяц настой гатовы. Цётка шмат яго рабіла. І ўвесь разыходзіўся. Асабіста бачыў, як да яе людзі з розных мясцін прыязджалі, нават з Польшчы.

Міхаіл прызнаецца, што апошнім часам вясёлкі стала мала, маўляў, лясы высякаюць, і грыб прападае. А вось попыт на яго расце. Нават з Масквы прыязджаюць.

Людзі, якія ведаюць сілу траў і розных лекавых раслін, наогул стараюцца таблеткамі не злоўжываць. «Цяпер усе валяр'янку купляюць, а цётка Ганна ішла на «панскае» балота, капала там валяр'янавы корань і сушыла. Потым залівала самагонкай і атрымлівалася тая ж самая валяр'янка, — аргументуе Міхаіл. — Я калі прыйшоў са службы ў Афгане, яна мяне гэтым сродкам лячыла. А яшчэ дуброўкай. У яе наогул настойкі на ўсе выпадкі жыцця былі. Каліну настойвала ад высокага крывянога ціску. Лыжку соку выпіваеш, калі адчуваеш, што галава пачала балець, і парадак. А калі прыходзіў прастыўшы, яна гарбату з малінніку або парэчніку рабіла. Лепш сродку ад прастуды і не прыдумаеш...

## НЕ НАШКОДЗЬ

Афіцыйная медыцына не адмаўляе лекавую сілу траў, але нагадвае, што ўжываць іх трэба вельмі асцярожна.

— Неабходна ўлічваць спадарожныя захворванні, узрост і шмат іншых фактараў. І абавязкова кансультавацца з урачом, — раіць **галоўны пазаштатны правізар упраўлення аховы здароўя аблвыканкама, загадчыца аптэкі Магілёўскага анкадыспансера Анжэла НЕРАСЦЕНКА.** — Эфект плацэба (вера ў тое, што прыняты сродак дапамагае) можа быць мацнейшы, чым лекавыя якасці самой травы. Наогул травы больш эфектыўныя на пачатковых стадыях захворвання, яшчэ болей як прафілактычныя сродкі. А калі нейкая сур'ёзная паталогія, аднымі травамі тут не абысціся.

Зборы, якія прадаюцца ў аптэцы, прайшлі клінічныя выпрабаванні. Пра ўсё тое, што праз аптэку не праходзіць, сказаць нешта канкрэтна нельга, гаворыць фармацэўт. Да траў трэба падыходзіць вельмі акуратна, яны могуць выклікаць алергію яшчэ большую, чым лекавыя сродкі. Апошнія, прынамсі, праходзяць ачыстку. А тут можа быць нейкі пылок, яшчэ нешта. Да таго ж травы, якія чалавек збірае і сушыць у хатніх умовах, не заўсёды могуць быць правільна нарыхтаваныя. Ад сушкі залежыць, якія рэчывы захаваюцца ў лекавай сыравіне.

Што датычыцца грыба вясёлкі, то звесткі накont яго наогул вельмі розныя. Не факт, што ён уплывае на ўсе ракавыя клеткі. Аднаму можа дапамагчы, а ў другога выклікаць непрадказальную рэакцыю. І зноў такі павінны ўлічвацца дазіроўкі, узрост, спадарожныя хваробы.

Адзінае месца ў Беларусі, дзе даўно і грунтоўна даследуюцца лекавыя расліны, кафедра фармакагнозіі Віцебскага медуніверсітэта. Там нават ёсць аптэчны агарод, дзе для гэтага вырошчваюць травы. Некалькі гадоў таму ва ўстанове вёўся прыём дактароў сумесна са спецыялістамі па фармакагнозіі. Яны распрацоўвалі травяныя саставы, зборы, якія нават здымалі людзей з гарманальных прэпаратаў пры бранхіяльнай астме.

Апошняя з распрацовак гэтай установы трава маклея. А яшчэ — цёмныя таблеткі валяр'янкі, якія цяпер прадаюцца. Яны спрасаваны менавіта з самой расліны. (А прывычныя жоўтыя — гэта яе экстракт.) У цёмных утрыманне валяр'янавай кіслаты, дзеючага рэчыва, большае. Калі праводзілі доследы ў медуніверсітэце, высветлілася, што тая дазіроўка, якая закладвалася ў жоўтую таблетку, выклікала моцны снатворны эфект. А вось цёмная дзейнічала мякка, аказвала на пацыента лёгкае заспакаяльнае ўздзеянне...

Здавалася б, проста, але гэтыя распрацоўкі ішлі кожная не менш чым па 10 гадоў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## Извещение о проведении 27 февраля 2018 года повторных торгов по продаже имущества, на которое обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование, местонахождение, характеристики продаваемого имущества)** | Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-708141649, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Алибегова, 26-102, площадь – 46,6 кв. м, назначение – квартира, наименование – квартира |
| **Начальная цена** | 88 290,00 бел. руб. |
| **Сумма задатка** | 8 829,00 бел. руб. |
| **Организатор аукциона** | Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, (017) 327-05-62 |

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 № 63, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, своевременно внесшие задаток и подписавшие соглашение с организатором торгов о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие в установленный срок организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Задаток перечисляется на расчетный счет № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, получатель – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение 20 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Аукцион проводится 27 февраля 2018 года в 09.30 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с 08.02.2018 по 22.02.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 327-48-36, (017) 327-40-22 – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости»

## Извещение о проведении 27 февраля 2018 года повторных торгов по продаже конфискованного имущества

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование, характеристики, местонахождение продаваемого имущества** | Квартира, расположенная по адресу: г. Минск, ул. Киселева, д. 4, кв. 80, общей площадью 75,1 кв. м, жилой площадью 31,2 кв. м (квартира расположена на 5-м этаже 5-этажного кирпичного дома 1955 года постройки, инвентарный номер в ЕГРНИ 500/D-93056) |
| **Начальная цена** | 193 963,90 бел. руб. |
| **Сумма задатка** | 19 396,39 бел. руб. |
| **Организатор аукциона** | Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, ком. 10 |

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 № 63, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, своевременно внесшие задаток и подписавшие соглашение с организатором торгов о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие в установленный срок организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Задаток перечисляется на расчетный счет № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, получатель – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение 20 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Аукцион проводится 27 февраля 2018 года в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с 08.02.2018 по 22.02.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 327-48-36, (017) 327-40-22 – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости»

Сямейная газета
Выпуск № 3 (94)



# КУСТ АЖЫНЫ

Бабуля сябра аддала мне ўпакоўку таблетак. «Можа прапануй каму, мне доктар прапісаў іншыя». Спачатку думала выкласці аб'яву на сайт «Аддам. Задарма», але потым успомніла пра сваю калегу, спадарыню Доўнар. Валянціна Аркадзеўна практычна штодзень з «народам на провадзе». Раптам каму з аўтараў вясёлых ды праўдзівых гісторый тыя лекі прыйдуцца дарэчы? «Я з чытачамі пра хваробы звычайна не гавару, — пачула ў адказ. — Але няхай паляжаць. ...Ведаеш, што мы робім з маім чалавекам (мае на ўвазе мужа), калі не можам знайсці кансэнсусу — напрыклад, куды павесіць чарговую фатаграфію? Замест таго, каб спрачацца, заўсёды кажам: «Няхай паляжыць».

Усё наша жыццё складаецца з сітуацый. Большасць з іх адбываецца зусім нечакана і ад нас, як правіла, не залежыць. Але адна з нямногіх рэчаў, якую мы кантралюем, — наша рэакцыя на гэтыя сітуацыі. Як мы да іх ставімся, так і жывём.

Не раз чула скаргі пажылых, што студэнты ўтаропіліся ў акно, абы не саступаць месца. Маўляў, «ну і моладзь пайшла, ніякага выхавання». Пачуўшы гэта, як правіла, хлопцы ды дзяўчаты месца саступаюць, але на гэтым канфлікт не спыняецца.

Каб пазбегнуць падобных сітуацый, я звычайна еду стоячы. Але на днях вырашыла правесці эксперымент. Уладкавалася на сядзенні ля акна і зрабіла выгляд, што заснула. Неўзабаве мяне «разбудзіла» абуранае «ну і моладзь...» Я хуценька падхапілася: маўляў, «бабулечка, не абурайцеся. Падумайце пра сваё здароўе. Хвалявацца шкодна. Дзякуй вялікі, што разбудзілі мяне, інакш бы праспала свой прыпынак»... І — што вы думаеце, бабульку, быццам падмянілі. Яна пачала мне расказваць, што едзе ў паліклініку. Што сапраўды доктар раіў не хвалявацца. Пажалілася на ўнучку, якая яе не цэніць, наведвае толькі, калі патрэбныя грошы. Карацей, расталіся мы ледзь не абдымаючыся. І я ў чарговы раз пераканалася, што найлепшая зброя супраць людзей, якія настроены агрэсіўна, гэта цеплыня і ўвага. Мы можам адказваць на ўдар ударам, тым самым памнажаючы негатыў, а можам змякчыць яго сваёй шчырасцю ды ўсмешкай. Калі не падкідваць дровы у чужую агрэсію, яна затухае.

Раней я перажывала, калі людзі, якім давярала, «падстаўлялі» мяне. Апошнім жа часам стараюся нічога ні ад каго не чакаць, і, ведаеце, трывога знікла... Недарэмна мудрыя людзі кажуць: калі навучышся пазбаўляцца ад чаканняў, ніколі не будзеш расчароўвацца.

— Вы адчуваеце боль, калі здраджваюць? — запыталіся падчас аднаго з інтэрв'ю ў Барыса Грабеншчыкова, лідара гурта «Акварыум».

— А як мне могуць здрадзіць?

— Нельга?

— А як? У мяне няма чаканняў. Калі вы, напрыклад, захочаце мне здрадзіць, то я буду не супраць, таму што і не чакаю, што вы будзеце мне верныя.

— Няўжо вы ні ад каго ў жыцці не чакаеце вернасці?

— А навошта? ...Вы чакаеце вернасці ад куста ажыны?

— Хацелася б, каб яна адпавядала, не пладзіла маліны замест ажын...

— Дык чыя гэта віна? Куста ажыны ці нас? Ад гэтага і ўсе беды. Таму што мы хочам, каб у жыцці ўсё было так, як мы хочам. Прычым як нас навучылі хацець.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

■ Незвычайнае побач

# ЗІМОВЫЯ ЗАБАЎКІ,

## або Любое надвор'е можна расквеціць багатай фантазіяй



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Вольга ЛАЗАРАВА разам з сынам Пякцеем радуюцца кожнаму снежнаму дзяньку.

**Не ведаю, як вы, а мы з сынам вельмі любім зіму. Але не такую, як сёлета, а сапраўдную, снежную, марозную. Калі можна ўволю пакатацца з горак, на лыжах, каньках. А як цудоўна ўпасці на снег і «намаляваць» анёлка ці зляпіць беласнежны замак...**

**А вось у што гуляць з дзіцем маласнежнай зімой? Што ўзяць з сабой на вуліцу, каб ажывіць шэры пейзаж. Мы сабралі самыя цікавыя парады, якімі дзеляцца маладыя мамы на форумах.**

***(Заканчэнне на 8-й стар. «СГ».)***

■ Быць разам

# «ГЭТА ПЁК НАШ ТАТА!»

**Так, з гонарам, кажуць Косця з Соняй, калі госці ў чарговы раз пачынаюць нахвальваць татавы пірагі. Мінчанін Руслан Пісарэнка ў свой час гэтак жа ганарыўся мамінымі бісквітамі ды піражкамі. Кажа, што яго дзяцінства было насычана водарам свежай выпечкі. Ён (той водар) і дагэтуль асацыюецца з утульнасцю, цеплынёй, бяспекай, Домам. Сям'я — сёння самае дарагое, што ёсць у таты траіх дзяцей. Шматдзетным, дарэчы, Руслан стаў зусім нядаўна. Перад самым Новым годам, 27 снежня, жонка падарыла яму сына Расціслава.**



Без Алены не было б ні пячэння, ні пірагоў...

## «Маме таксама трэба адпачываць»

Сустрэліся мы з Русланам зранку, у кавярні, што непадалёку ад яго дома. «У госці не запрашаю, бо сын яшчэ зусім маленькі. Для яго нават калі тата майку памяняў — гэта ўжо занадта вялікае ўражанне. Маўляў, хто ты такі? Першы тыдзень пасля яго нараджэння я хадзіў у паласатай бела-сіняй майцы, а пасля памяняў на аднатонную, сінюю. Дык Росцік мяне вельмі доўга падазрона разглядаў».

***— Як адчуваеце сябе ў статусе шматдзетнага таты? Штосьці змянілася ў жыцці?***

— Ды не, пакуль нейкіх значных змен не заўважыў. Адзінае, што часу ў сутках на сябе стала яшчэ менш *(смяецца)*.

***— Вы, напэўна, з тых татаў, якія прачынаюцца ноччу?***

— Бачна, што не выспаўся? *(Усміхаецца.)* Прачынаемся па чарзе з жонкай. Алена выконвае функцыю мамы. А я раблю Росціку масажык. Як толькі пачынае хныкаць, кладу яго на спавівальны столік і ціхенька разміназю жывоцік. Пасля гэтага малы імгненна засынае. Па магчымасці, стараюся дапамагаць Алене з дзецьмі. Ёй жа таксама трэба адпачываць.

***(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)***

■ Сітуацыя

# ПАДНЯЦЦА «З ДНА»

## Калі хочаш змяніцца — шукай магчымасці

**У старэнькай кватэры чуваць упэўненыя дзіцячыя крокі. Цемнавокі хлопчык гойсае па пакоях, але ўсё адно стараецца не адыходзіць далёка ад мамы. На яго разуменне, гэта самы надзейны, добры і моцны чалавек у свеце.**

**Для Ганны (*прозвішча не называецца па просьбе гераіні. — Аўт.*) права быць з сынам — перамога над сабой і над тымі меркаваннямі, што склаліся ў грамадстве пра бацькоў, «чым дзецям лепш будзе жыць у інтэрнаце».**

### Не бывае безнадзейных людзей

«Калі нарадзіўся Давід, нас доўга не выпісвалі з бальніцы. Дактары ставіліся ўважліва, аднак я ўвесь час адчувала жах. Баялася, што зноў забяруць сына, як гэта ўжо было аднойчы», — так жанчына пачынае сваю гісторыю.

У сацыяльных службаў былі падставы пільна сачыць за маладой маці. У вачах людзей яна была «нядобранадзейнай асобай» з цьмяным мінулым, складаным дзяцінствам і судзімасцю. Пра ўсе гэтыя акалічнасці Ганна расказвае проста, не прыхарошваючы, але і не прыніжаючы таго, што было. Яна спадзяецца, што прыклад яе жыцця дапаможа іншым паверыць — не бывае безнадзейных людзей і сітуацый.

— Мы жылі ў той частцы горада, адкуль рэдка хто «выбіваецца ў людзі». З маленства бачыла п'яныя застоллі, бойкі. З сястрой і братам былі пакінуты на саміх сябе. У школе дзеці з нас смяяліся, здаралася, што не было адзення і прыладаў, каб пайсці на ўрокі.

У шостым класе дзяўчына кінула вучобу, крыху пазней на сем гадоў з'ехала ў Мінск шукаць новыя магчымасці, а ў выніку звязалася з «дрэннай кампаніяй».

— Тады я мала задумвалася, што можна рабіць, а што нельга. Жыццё ўспрымалася, як рызыкоўная гульня, дзе трэба ўвесь час правяраць свой спрыт. Так пачала красці, упершыню паспытала наркотыкі і стала залежнай. Азіраючыся назад, дзіўлюся: «Божа, няўжо мне тады ні разу не прыходзіла думка, што жыццё можа вярнуць учынкі бумерангам?»

### У тым горадзе, дзе ўсё ўжо пустыня...

Гэта радок з верша, які Ганна аднойчы напісала, яшчэ не ведаючы, што ён стане ў нейкім сэнсе прарочым.

> **«Бачу, што прыёмная сям'я любіць майго сына, клапоціцца пра яго. Хацелася б быць побач, але разумею, што пакуль яму будзе там лепш».**

— У 2011-м мяне пасадзілі ў турму за захоўванне наркотыкаў. Калі прыйшла міліцыя, нас у кватэры было трое — я, сястра і брат. Узяць віну на сябе мне падалося высакародным учынкам, зусім як у кіно. Аднак тры гады прайшло, і ні брат, ні сястра не падумалі мяняцца.

Месца зняволення сапраўды нагадвала пустыню — там таксама не адчувалася жыццё. Аднолькавыя дні, многія жанчыны выглядаюць і паводзяць сябе, як робаты. Не скажаш, што Ганну лічылі адшчапенцам, дзякуючы вясёламу характару яна часта станавілася «душой кампаніі».

На двары калоніі вылучаліся дзве пабудовы. З аднаго боку быў клуб, з другога — царква.

— Нават не ведаю, чаму пайшла да храма. Аднак выстаяла ўсю службу, хоць адчуванне было такое, быццам разрываюся на часткі. Дзіўна, да таго дня я не лічыла сябе веруючай. Аднойчы да нас прыехаў святар з Гомеля, амаль усе насельнікі калоніі прыйшлі па блаславенне. Памятаю, асабліва ўразіў яго позірк — вакол жанчыны з цяжкімі лёсамі, а гэты чалавек глядзіць на іх з такой спагадаю! Тады, мусіць, я і зразумела, што Бог не ў словах, Ён у такой бескарыслівай любові ў вачах.

### Дарога да сябе

Пакуль Ганна адбывала тэрмін зняволення, Багдана — яе першае дзіця — забрала прыёмная сям'я. Калі жанчына вярнулася ў Баранавічы, то адразу паспрабавала знайсці сына. Яна не была афіцыйна пазбаўленая бацькоўскіх правоў, аднак прыёмныя бацькі лічылі, што ім не варта бачыцца.

— Я разумела, што «згубіла твар» перад грамадствам, і гэта ўжо не забудуць і не даруюць. Але ўжо тады ведала: хачу змяніцца! Напачатку існаваў нават нейкі спецыфічны азарт: «Ах, вы не верыце, што такое магчыма? Што ж, памяняюся насуперак вашым уяўленням!»

Жанчына ўладкавалася працаваць на швейную фабрыку. За яе паводзінамі быў пільны нагляд, як за абавязанай асобай. З заробку вылічвалася сума доўгу за ўтрыманне Багдана ў інтэрнаце і плата за жыллё — аказалася, што тры гады ніхто з сямейнікаў не аплачваў камунальныя паслугі. Акрамя таго, у брыгадзе дазналіся пра мінулае калегі і пачаліся касыя позіркі.

— Аднойчы я спазнілася на работу на 15 хвілін і атрымала мільён рублёў штрафу. Калі ўлічыць, што заробак і так невялікі, рашэнне кантрольных службаў аказалася сур'ёзным ударам. Потым нібы найшло нейкае ачмурэнне: сярод ночы сабрала рэчы ў пакет, злавіла першую «папутку» і падалася ў Маскву.

Жыццё нібы пачалося з чыстай старонкі. Ганна працавала дыспетчарам, часткова зараляла сама, часткова была на ўтрыманні мужчыны, з якім аднойчы пазнаёмілася. Той счараваў ласкавым абыходжаннем, у пары нарадзілася дачка...

Пасля гэтага адносіны мужчыны памяняліся. Ён страціў да каханкі цікаўнасць, малую адабраў і звёз да сваіх родзічаў. Пачаў біць, забіраць грошы. Дайшло да таго, што аднойчы, ужо цяжарная Давідам, Ганна проста збегла з дому...

### Лёс і надзея

— Страху перад міліцыяй не было — ведала, што змагу нарадзіць нават у калоніі, затое мы з сынам будзем жывыя і ў бяспецы. Куды больш непакоіла, што гэта дзіця таксама адбяруць і я ніяк не змагу супрацівіцца. Па нумары ўстановы па аказанні дапамогі ў складанай жыццёвай сітуацыі «Лёс і надзея» патэлефанавала без усялякіх спадзяванняў. Адказала Ірына Логвін. Найперш яна распытала пра цяперашняе становішча, параілася, які вынік хачу атрымаць. Нічога важней за Давіда ў мяне тады не было.

> **«Мы з сястрой і братам былі пакінуты на саміх сябе. У школе дзеці з нас смяяліся, здаралася, што не было адзення і прыладаў, каб пайсці на ўрокі».**

Валанцёры арганізацыі падказалі занесці дакументы на дзіця па месцы працы. Такім чынам Ганна атрымала матэрыяльную дапамогу. Пасля выпіскі з бальніцы сям'я некаторы час жыла на здымнай кватэры, аднак сродкаў не хапала, і Ганна вярнулася ў бацькоўскі дом. Як магла, зрабіла там рамонт. Увесь гэты час яе матэрыяльна падтрымлівала «Лёс і надзея».

— Канешне, да нас хадзілі камісіі ад розных установаў. Праверкі нервавалі, але Ірына тлумачыла, як трэба сябе паводзіць, раіла рабіць копіі дакументаў, не падпісваць бязглуздыя паперы. Я ведала, што атрымаю прадукты, лекі і псіхалагічную падтрымку. А яшчэ — не хацела падводзіць людзей, што паверылі ў мяне.

Абачлівасць і бездакорныя паводзіны далі свой плён. Жанчыну знялі з уліку ў наркалагічным диспансеры, у жніўні ўдалося арганізаваць дзень нараджэння для Багдана і атрымаць дазвол бачыцца з ім. Пакуль што забіраць хлопчыка назад рызыкоўна: сям'я Ганны ўсё яшчэ знаходзіцца на ўліку СНС (сацыяльна небяспечнае становішча. — **Аўт.**).

— Бачу, што прыёмная сям'я любіць майго сына, клапоціцца пра яго. Хацелася б быць побач, але разумею, што пакуль яму будзе там лепш.

На сёння самая вялікая праблема нашай гераіні — жыллё. У кватэры жыве брат Ганны, і свае паводзіны ён змяняць не збіраецца. Жанчына вымушана цярпець, пакуль за суседнімі дзвярамі гуляе п'яная кампанія. Аднойчы яна не вытрымала і патэлефанавала ў міліцыю. Як вынік — нічога не памянялася, затое яе і Давіда паставілі на ўлік СНС. Тым не менш у будучыню маці глядзіць з аптымізмам.

— Вясной да нас павінна прыйсці чарговая камісія. Спадзяюся, мы пакінем добрае ўражанне. Потым у мяне скончыцца дэкрэтны адпачынак, Давід пойдзе ў садзік. Магчыма, я змагу больш зарабляць, бо пакуль пасля ўсіх выплат наша сям'я мусіць жыць на 130 рублёў у месяц. Дапамагаюць валанцёры, аднак яны не могуць выдзяляць пастаянную матэрыяльную падтрымку. Разам з арганізацыяй «Лёс і надзея» пішам лісты ў органы ўлады, просім асобнае жыллё. Я разумею, як цяжка, апынуўшыся «на дне», вярнуцца да звычайнага жыцця. Аднак жа ёсць тыя, хто хоча змяняцца! Шукайце магчымасці, шукайце неабыякавых людзей, і лёс пойдзе вам насустрач. Для сябе ўжо вырашыла: калі атрымаецца, буду таксама дапамагаць людзям. Кансультаваць, падтрымліваць — даваць усё тое, чаго так не хапала на самым пачатку майго шляху.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

### ПРАСІЦЬ ДАПАМОГІ НЕ СОРАМНА

**Юрыдычна ўстанова «Лёс і надзея» існуе другі год. Спецыялісты ставяць сваёй мэтай аказваць усебаковую падтрымку сем'ям і грамадзянам, што хочуць пераадолець або папярэдзіць складаную жыццёвую сітуацыю. Якім чынам гэта зрабіць, мы пагутарылі з Ірынай ЛОГВІН, адной з арганізатараў дабрачыннай установы.**

***— Ірына, раскажыце, якім чынам узнікла ідэя кансультаваць сем'і ў крызісным становішчы?***

— Усё пачалося з праекта падтрымкі маладых мам. У большасці выпадкаў, прычынай адмовы ад дзіцяці было не столькі нежаданне яго мець, колькі сацыяльны цяжар. На той час дабрачынныя арганізацыі працавалі па вузкай спецыяльнасці, і мы вырашылі ахапіць кірункі, па якіх у Беларусі мала хто працуе.

***— Якую дапамогу прапануе «Лёс і надзея»?***

— Дапамагаем матэрыяльна, прававой кансультацыяй і эмацыянальна-псіхалагічнай падтрымкай. Мы не вырашаем усе праблемы кліента — гэта немагчыма. Але распрацоўваем алгарытм выхаду з крызісу, дапамагаем рэалізаваць усе сацыяльныя гарантыі, якія прапануе дзяржава. Асноўнае правіла — не ціснуць на чалавека. Выбар ён робіць сам, можа нават адмовіцца ад барацьбы. Тэрміновую матэрыяльную падтрымку аказваем, аднак асноўная наша работа — дапамагчы скласці запыты ў дзяржаўныя ўстановы.

***— Чаму так цяжка бывае атрымаць афіцыйную дапамогу?***

— На жаль, у грамадстве, у тым ліку сярод адказных асоб, існуе меркаванне, што скаржнік «сам вінаваты». Маўляў, не трэба было рабіць глупстваў — не пакутаваў бы цяпер. Але зробленага не вернеш. Калі пакінуць чалавека сам-насам з бядой, ён пачне скочвацца далей.

***— Ці з любой праблемы можна знайсці выйсце?***

— Наша краіна прапануе рознабаковую сацыяльную падтрымку. Іншая справа — заканадаўства не можа прадугледзець усе выпадкі, таму здараюцца «тупіковыя сітуацыі». Як прыклад, магу прывесці гісторыю Ганны. Так, мы многага дабіліся, але некаторыя пытанні да гэтага часу адкрытыя. Сацыяльны цэнтр не выдае матэрыяльную падтрымку, бо маці — абавязаная асоба. З гэтай жа прычыны Ганна не можа ўладкавацца на больш прэстыжную работу, ды і сямейная сітуацыя не дадае сімпатый у патэнцыйнага наймальніка. Так што застаецца толькі пісаць запыты і прасіць заканадаўчы алгарытм выхаду з крызіснага становішча.

***— Як трэба правільна прасіць дапамогі?***

— Найперш — супакоіцца. Не прымаць неабдуманых рашэнняў. Некаторыя кліенты на эмоцыях выкрыкваюць: «Вы мяне несправядліва пакрыўдзілі, зараз паскарджуся ў Адміністрацыю Прэзідэнта!» Гэта памылковы шлях. Трэба пачынаць з запыту ў тую інстанцыю, дзе вам адмовілі, зрабіць копію адказу і пісаць наступны запыт у раённыя органы, потым, калі праблема не вырашана, на вобласць і гэтак далей. Чалавек з міністэрства бачыць вашу праблему ўпершыню і не паедзе разбірацца з ёй ад пачатку. Бывае, праблема вырашаецца, як толькі кліент атрымлівае інфармацыю, да каго трэба звярнуцца.

# КІРОЎЦА ПАВІНЕН БЫЦЬ ПЕСІМІСТАМ

## У гэтым перакананы заснавальнік цэнтра контраварыйнай падрыхтоўкі

**Штодзень на беларускіх дарогах адбываецца прыкладна 5-6 аварый, у якіх гінуць ці атрымліваюць раненні людзі. Толькі за апошнія чатыры гады загінула каля 2400 чалавек. За гэтай лічбай — трагедыі канкрэтных сям'яў. У кагосьці дарога забрала маму ці тату, у кагосьці — мужа ці дзетак... Як працягваць ездзіць на любімым аўтамабілі і пры гэтым заставацца ў жывых ды нікога не траўмаваць? Пра гэта размаўляем з майстрам спорту і неаднаразовым чэмпіёнам Беларусі па аўтаралі, дырэктарам цэнтра контраварыйнай падрыхтоўкі Сяргеем АЎЧЫННІКАВЫМ. На інтэрв'ю ён прыехаў на сваім Subaru Legacy сярэбранага колеру.**


Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

### Пра круты джып ды адносіны з хуткасцю

**— Сяргей Алегавіч, чамусьці думала, што ў вас дарагі джып. Па якіх крытэрыях выбіралі сабе машыну?**

— Я шмат езджу па Беларусі, у тым ліку ўзімку, і мне патрэбна павышаная праходнасць. Таму для мяне важна, каб машына была поўнапрывадная. Ведаю людзей, якія набываюць крутыя джыпы. Камусьці гэта патрэбна для іміджу, камусьці для перавозкі вялікай сям'і з лыжамі, санкамі. Ёсць і тыя, хто спрабуе пры дапамозе дарагой машыны штосьці даказаць іншым. Я нікому нічога не збіраюся даказваць. Ды і вялікі джып мне проста не патрэбны: навошта мне вазіць паветра. Я езджу пераважна адзін. Прынцыпова не набываў машыну з салона, бо часта перавожу штосьці на лецішча. Мой аўтамабіль далёка не новы, але ён мяне цалкам задавальняе.

**— Па статыстыцы вялікая колькасць аварый адбываецца з-за перавышэння хуткасці. Як вы, гоншчык, да гэтага ставіцеся?**

— Я вельмі паважліва стаўлюся да хуткасці, бо разумею, што чым яна вышэйшая, тым менш у мяне шанцаў. З фізікай нічога не паробіш. Я гэта правяраў за межамі дарогі. Падчас спаборніцтваў не раз пераварочваўся, вылятаў у кювет. Думаеце, чаму гоншчыкі едуць больш павольна? Бо не па чутках ведаюць, што ёсць мяжа, пасля якой ад іх нічога не залежыць. Многія ж з аматараў паганяць, каб адчуць адрэналін, на жаль, не разумеюць усіх наступстваў і не адчуваюць той мяжы.

### Пра экспрэс-курс выхаду з заносу дыката на дарозе

**— Чула, што вы вырашылі адкрыць цэнтр контраварыйнай падрыхтоўкі пасля таго, як самі ў якасці пасажыра трапілі ў аварыю?**

— Так. Мы ехалі па даволі шырокай маскоўскай трасе, і машына трапіла ў зусім маленькі занос. Кіроўца павярнуў руль куды трэба, але зашмат. І машына з маленькага заносу тут жа трапіла ў наступны, вельмі сур'ёзны. У выніку яе вынесла на сустрэчную паласу. Нам пашанцавала: машына, відаць, зачапілася за снег і вылецела ў кювет. Тым самым мы пазбеглі сутыкнення з ЗІЛам, які ехаў па сустрэчцы. Я ўбачыў, што кіроўцы не ўмеюць выходзіць з самай банальнай сітуацыі, яны проста бездапаможныя. Давайце пакажу вам відэа, дзе зусім маленькі занос прыводзіць да трагедыі *(глядзіце на сайце www.zviazda.by)*. Разумею, калі б кіроўца ляцеў 150 км/г, не ўпісаўся ў паварот і перакуліўся. Сам вінаваты. А тут ехаў спакойна, па правілах, кола трапіла ў снежную кашу. Машыну крыху занесла. Кіроўца не справіўся... Мне захацелася перадаць свае веды і навыкі. Цяпер бачу, што гэта насамрэч патрэбна. Людзі часта тэлефануюць, дзякуюць. Месяцы тры таму дзяўчына ехала па кальцавой дарозе, за ёй на сваёй машыне яе муж (яны ў нас вучыліся ў цэнтры). Нечакана на сустрэчку выскачыла іншамарка. Мая вучаніца паспела збочыць, паказаўшы паварот, каб папярэдзіць мужа, што яна будзе мяняць паласу. У падобных сітуацыях думаць часу няма. Трэба рэагаваць імгненна. Калі чалавек паслізнуўся і падае, ён рэфлектыўна падстаўляе рукі. Так і тут, важна напрацоўваць аўтарэфлексы. А вы, дарэчы, ведаеце, куды трэба руль круціць, калі машыну заносіць? *(Звяртаецца да мяне.)*

**— У бок, супрацьлеглы заносу.**

— Гэта пры якім прывадзе?

**— Пярэднім.**

**НЕЛЬГА САДЗІЦЦА ЗА РУЛЬ У СТОМЛЕНЫМ СТАНЕ**
**Вельмі шмат сітуацый, калі кіроўца засынае падчас руху. Прычым трагедыі адбываюцца звычайна пры пад'ездзе да дома, бо чалавек расслабляецца. Калі стаміліся, спыніцеся ды адпачніце. У нас у цэнтры ёсць правіла: калі ў дальнюю дарогу выпраўляецца вялікая кампанія, не спяць кіроўца і пасажыр справа. І адказнасць на іх аднолькавая.**

— А калі машына заднепрывадная? Ага, задумаліся. А хочаце навучу? *(Сяргей Алегавіч усаджвае мяне на крэсла, працягвае руль-трэнажор)*. Уявіце, вы едзеце. Тут вас раптам заносіць улева *(паварочвае мой руль налева)*. Куды вы глядзіце? Гэта самая распаўсюджаная памылка большасці кіроўцаў, яны глядзяць на дрэвы і кювет (у такім выпадку яны туды і ўедуць). А трэба глядзець на дарогу. Туды ж і руль круціць, у той бок, куды хочаце ехаць. І не важна, якая машына, пярэдне-, задне- ці поўнапрывадная. Вось вы і прайшлі экспрэс-курс выхаду з заносу *(усміхаецца)*.

**— Вы праглядаеце зводку з аварыямі, якія адбываюцца?**

— Прыходзіцца гэта рабіць. Але, калі шчыра, мне гэта не прыносіць задавальнення. Калі бачу бітыя машыны, разумею, што адбылося з людзьмі. Праглядаючы зводкі ДАІ, бачу, што вельмі часта аварыі адбываюцца не з ліхачамі. Гіне не той пацан на БМВ, які штосьці камусьці дэманстраваў, перавышаючы хуткасць, як усе ўяўляюць. Вылятаюць у кювет сталыя мужчыны, што везлі родных з нейкай вёскі, маладыя маці з маленькімі дзеткамі....

**— Маеце на ўвазе сітуацыю, калі жанчына-кіроўца вылецела ў кювет, бо на дарогу выбег кот?**

— І гэтую таксама. У той жа самай Амерыцы пры здачы на правы ў білетах ёсць пытанне: «Што павінен зрабіць кіроўца, рухаючыся на вялікай хуткасці ў шчыльным патоку аўтамабіляў, калі кошка ці сабака нечакана выбеглі на дарогу?» Як вы думаеце, які правільны адказ? Правільна: раздушыць. Прагматычна, але гэта так. Калі не раздушыць, значыць, машыну хутчэй за ўсё занясе і яна вылеціць у кювет. На вялікай хуткасці нельга манеўраваць. Максімум — тармазіць. А часам і тармазіць нельга. Лічу, што падобную практыку трэба пераймаць і нам. Дробязяў на дарозе не бывае. У амерыканскіх аўташколах будучым кіроўцам паказваюць 7-гадзінны фільм. Ён пра тое, як чалавек парушае ПДР, гіне, потым ляжыць у труне, а яго бацькі, жонка, сын плачуць. Я таксама адзін падобны сацыяльны ролік паказваю сваім вучням, магу і вам паказаць *(глядзіце на сайце www.zviazda.by)*.

**— А ў ролі кіроўцы хоць раз траплялі ў ДТЗ?**

— Двойчы. На шчасце, у мяне аварыі былі несур'ёзныя. Адзін раз стаяў на святлафоры на спуску, на перакрыжаванні каля цырка, і на маю машыну «наехалі» ззаду. Дзявацца не было куды, спераду стаяла іншая.

Аднойчы зімой сустрэчная іншамарка не ўбачыла мяне з-за машын, якія стаялі, і пачала паварочваць. Была слізкая дарога, я ехаў на хуткасці 50 км/г. Зразумеў, што не паспяваю спыніцца, таму накіраваў машыну ў пярэдняе кола, каб не траўмаваць людзей (у салоне, акрамя кіроўцы, былі дзве жанчыны — яго жонка і цешча). Бываюць сітуацыі, калі немагчыма пазбегнуць сутыкнення, тады трэба зменшыць наступствы. Мы ў цэнтры вучым, што ў падобнай сітуацыі лепш біць ці ў пярэдняе кола ці ў задняе, бо паміж колаў «жылая зона», там, як правіла, знаходзяцца пасажыры.

### Пра «мёртвыя зоны» ды правіла трох «Д»

**— Сяргей Алегавіч, які вы кіроўца?**

— Песімістычны. На дарозе лепш быць песімістам, чым аптымістам. Калі ўязджаю ў двор, напрыклад, то заўсёды думаю, што там можа бегчы дзіця ці выязджаць машына. Калі кіроўца дапускае горшае, ён да гэтага гатовы, зніжае хуткасць, каб паспець спыніцца. Я зімой езджу часта павольней, чым іншыя. Бо калі бачу снег, то дапускаю, што пад ім лёд. А паварот круты, і той, хто едзе хутка, вылеціць у кювет.

У нас у аўташколах вучаць кіраванню па ПДР, а за мяжой не толькі па ПДР, але і па правіле трох «Д» (Дай Дарогу Другому). Гэта, лічу, вельмі правільна. Калі ў Германіі хтосьці, нягледзячы на знак «саступі дарогу», нясецца на ўсёй хуткасці, то кіроўца, хоць і мае перавагу, абавязкова прытармозіць. А ў нас (назіраю гэта штодзень) «я еду, не гледзячы па баках, бо на галоўнай дарозе». А можа, знак за кустамі і кіроўца яго не бачыць, ці перакрыжаванне настолькі слізкае, што ён не зможа спыніцца? Таму ў Германіі, калі ты едзеш па галоўнай дарозе, а па другаснай пад'язджае іншая машына, кіроўцы абавязкова ўсталююць візуальны кантакт, каб пераканацца ў сваёй бяспецы.

**— Можаце назваць асноўныя памылкі кіроўцаў-пачаткоўцаў, якія прыводзяць да аварый?**

— Іх шмат. Назаву толькі некаторыя з іх. На жаль, не ва ўсіх аўташколах вучаць кантраляваць паваротам галавы «мёртвыя зоны». У нас гэта міна запаволенага дзеяння, якая, на жаль, спрацоўвае. Колькі выпадкаў, калі на кальцавой на хуткасці 90 км/г такі недавучаны кіроўца мяняе паласу і адкідвае ў адбойнік машыну, якая ў гэты момант знаходзілася ў «мёртвай зоне». Калі вы нічога не парушаеце, спакойна едзеце па дарозе, усё адно няма гарантыі, што хтосьці не паверне руль і не здзейсніць аварыю. Таму не трэба доўга знаходзіцца ў «мёртвай зоне».

Каб вырашыць гэту праблему, не патрабуецца фінансавых укладанняў. Трэба толькі пры прыёме экзаменаў ставіць стварэнне аварыйнай сітуацыі, калі прэтэндэнт на пасведчанне кіроўцы не кантралюе «мёртвую зону». І тады ўсе аўташколы будуць навучаць так, як трэба, як робяць уся Еўропа, Амерыка, Канада, Аўстралія... Немагчыма ў Германіі здаць на правы, калі кіроўца не пракантраляваў паваротам галавы «мёртвую зону» перад змяненнем паласы.

Калі кіроўца перасаджваецца на машыну з аўтаматычнай каробкай пераключэння перадач, не заўсёды разумее, што яна рэагуе на педаль газу са спазненнем. Гэта вельмі небяспечна, асабліва перад крутым паваротам ці разваротам. Кіроўца націснуў на педаль газу, машына не едзе. «Напэўна, мала націснуў», — думае і дадае... Машына вылятае на сустрэчку ці ў бардзюр.

Таксама кіроўцы, на жаль, не ўмеюць экстранна (хутка) разганяцца і тармазіць. Проста ніколі ў жыцці не націскалі на педаль тормазу рэзка, каб спрацавала АБС. Часам з-за гэтага ўзнікаюць аварыі. Напрыклад, кіроўца пачынае тармазіць, яго штосьці сціскае па назе, ён пужаецца, адпускае педаль тормаза і ўязджае ў іншую машыну. Раю паспрабаваць у бяспечных умовах, дзесьці за горадам, прымяніць экстраннае тармажэнне, каб адчуць свой аўтамабіль. Часам гэта можа выратаваць жыццё.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

### Лайфхакі ад Сяргея Аўчыннікава

**ЯК ЗАСТАЦЦА СПАКОЙНЫМ, КАЛІ СУСТРАКАЕШ ХАМАЎ НА ДАРОЗЕ?**

Калі хтосьці вас, напрыклад, падрэзаў і ўнутры ўсё кіпіць, можна сказаць уголас якое-небудзь слова ці выраз. І гэта будзе выхадам вашай негатыўнай энергіі. І ездзьце сабе спакойна далей. Але жадаць нядобрага кіроўцу-хаму не трэба. Бо гэтае пажаданне можа бумерангам вярнуцца назад. Асабіста я, можа з вопытам, можа з узростам, да хамаў на дарозе стаўлюся даволі спакойна, гляджу на іх як на неразумных дзяцей. Вось, напрыклад, мой маленькі ўнук нашкодзіў, ён жа ж не разумее. Няўжо я буду на яго крыўдзіцца?

**ЯК ПАЗБЕГНУЦЬ АВАРЫІ НА СЛІЗКАЙ ДАРОЗЕ?**

Раю авалодаць навыкам выхаду з заносу. Будзьце асабліва асцярожныя перад пешаходнымі пераходамі. Гэта месца, дзе ўсе тармозяць і разганяюцца. Калі паглядзець уважліва, там утвараецца дзве «коўзанкі». Часам, каб не ўехаць у пешахода ці ў багажнік пярэдняга аўто, варта перамясціцца крыху ўлева ці ўправа, там утрамбаваны снег і тармажэнне будзе значна лепшым.

**В связи с прекращением основной деятельности ООО «ЭлектроСпецПроект» (протокол 1 от 22.12.2017 г.) Первичная профсоюзная организация Общества с ограниченной ответственностью «ЭлектроСпецПроект» прекращает деятельность**

Требования кредиторов могут быть заявлены в течение 2 месяцев с момента опубликования настоящего сообщения по адресу: 220113, г. Минск, Логойский тракт, 10, офис 3 (подъезд – 4, этаж – 19).

УНП 102386901

**19 февраля 2018 года в 10.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Брестская трикотажная фирма «Элма»**

**Повестка дня**

О сделках Общества.

Местонахождение ОАО: г. Брест, ул. Куйбышева, 13.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Куйбышева, 13 (кабинет директора).

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Брест, ул. Куйбышева, 13 с 12 февраля 2018 года по 18 февраля 2018 года с 9.00 до 16.00 либо 19 февраля 2018 года по месту проведения собрания.

Начало регистрации участников собрания: 9.30.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 12 февраля 2018 года.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

Совет директоров.

УНП 200295587

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «БПС-Сбербанк»; г. Минск, бульвар им. Мулявина, 6 |
| **Лизингодатель** | ЗАО «БПС-лизинг»; г. Минск, ул. Цнянская, 12, оф. 101–104 |

**Предмет аукциона**

**Право на заключение соглашения о перенайме по договору финансовой аренды (лизинга) № 10-09/11 от 30 ноября 2011 года на административное здание банка со следующими характеристиками**

| **Наименование** (назначение) | **Общая площадь** | **Инвентарный номер** | **Адрес** |
|---|---|---|---|
| **Административное здание банка** (здание административно-хозяйственное) | 1668 кв. м | 230/С-12792 | Витебская обл., Лепельский р-н, г. Лепель, ул. Войкова, 130А |
| **Составные части и принадлежности** | Подвал | | |
| **Сведения о земельном участке** | Земельный участок, общ. пл. 0,3063 га, предоставлен на праве постоянного пользования для строительства и обслуживания административного здания | | |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | **395 538,66 бел. руб. (снижена на 10 %)** | | |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (**BYN**) перечисляется на счет **BY60BLBB30120191021390001001;** нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на счет: в долларах США (**USD**) – **BY76BLBB30120191021390001004** в евро (**EUR**) – **BY33BLBB30120191021390001002;** в российских рублях (**RUB**) – **BY22BLBB30120191021390001006** в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

| | |
|---|---|
| **Срок подписания соглашения о перенайме** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |
| **Дополнительная информация** | Дата заключения договора финансовой аренды (лизинга) – 30 ноября 2011 года. Срок лизинга – 84 месяца. Соглашение о перенайме будет оформлено в виде дополнительного соглашения к договору лизинга. Остаток невыплаченной контрактной стоимости с учетом НДС по договору лизинга составляет 32 613,26 бел. руб. |

**Условия аукциона**

Ставка по лизингу для нового лизингополучателя сохраняется не ниже действующей в настоящее время, срок договора лизинга – не короче срока уже действующего договора.

Лизингополучатель вправе досрочно выкупить предмет лизинга при условии уплаты лизингодателю в полном объеме всех оставшихся непогашенными лизинговых платежей, предусмотренных графиком лизинговых платежей, а также начисленных штрафных санкций, уплаты невозмещенных расходов лизингодателя и иных предусмотренных договором неисполненных обязательств

**Условия оплаты предмета аукциона**

Оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения соглашения о перенайме

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 14.12.2017 г.

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **26.02.2018** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **22.02.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | +375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by |

# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «Выигрывай по-MASTERски!»

Белгазпромбанк

Энергия твоего будущего!

Настоящие правила проведения рекламной игры «Выигрывай по-MASTERски!» (далее – Правила), направленной на повышение объемов безналичных расчетов с использованием **зарплатных карточек платежной системы Mastercard**, эмитированных ОАО «Белгазпромбанк» (далее – **зарплатные карточки Mastercard**), разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры **«Выигрывай по-MASTERски!»** (далее – Рекламная игра).

**1. Сведения об организаторе.**

Организатором Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «ТриВижн», УНП 190624910, зарегистрировано 19 мая 2005 г. решением Минского городского исполнительного комитета в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190624910 (далее – Организатор).

Юридический адрес и местонахождение Организатора: 220030, Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Независимости, 11/2, офис 328.

1.1. Заинтересованное лицо – ОАО «Белгазпромбанк».

**2. Наименование Рекламной игры:** «Выигрывай по-MASTERски!».

**3. Территория проведения Рекламной игры:** Республика Беларусь.

**4. Период проведения Рекламной игры:** с 12.02.2018 г. по 15.06.2018 г., включая период розыгрыша и вручения призов.

**5. Комиссия по проведению Рекламной игры:**

для контроля за ходом Рекламной игры создается комиссия по ее проведению. Комиссия осуществляет свою деятельность в период проведения Рекламной игры. Комиссия состоит из Председателя и 4 членов.

Председатель комиссии:

Носик Дмитрий Викторович, директор ООО «ТриВижн».

Члены комиссии:

1. Алехно Наталья Вячеславовна, заместитель директора ООО «ТриВижн»;

2. Лешко Диана Валерьяновна, юрисконсульт ООО «ТриВижн»;

3. Врублевская Ольга Александровна, главный бухгалтер ООО «ТриВижн»;

4. Ильюшина Юлия Александровна, главный специалист отдела маркетинговой информации и анализа управления информационной политики ОАО «Белгазпромбанк».

Комиссия осуществляет контроль за соблюдением настоящих Правил проведения Рекламной игры, рассматривает возникшие жалобы и предложения со стороны Участников. Члены комиссии обязаны осуществлять возложенные на них полномочия в течение периода проведения Рекламной игры.

**6. Наименование услуг, в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра:** стимулирование объемов безналичных покупок с использованием **зарплатных карточек Mastercard** ОАО «Белгазпромбанка».

**7. Состав и размер призового фонда Рекламной игры и источники его формирования:**

призовой фонд Рекламной игры составляет сумму в размере **100 000,00 (сто тысяч) белорусских рублей 00 копеек,** формируется за счет денежных средств Заинтересованного лица и состоит из:

| № п/п | Наименование приза | Стоимость приза, бел. руб. | Количество призов, шт. | Общая сумма, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Денежный приз | 100,00 | 1 000 | 100 000,00 |

**8. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится Участником Рекламной игры:**

8.1. Участниками Рекламной игры могут быть граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство в Республике Беларусь, и постоянно проживающие на территории Республики Беларусь, лица без гражданства, которым предоставлен статус беженца в Республике Беларусь, и достигшие 18 лет на момент совершения с использованием **зарплатных карточек Mastercard, эмитированных ОАО «Белгазпромбанк»,** безналичной операции оплаты товаров (работ, услуг), соответствующей условиям настоящих Правил, и совершившие действия, предусмотренные пунктом 9 настоящих Правил.

8.2. Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства, а также Члены комиссии по проведению Рекламной игры.

**9. Для участия в Рекламной игре необходимо в период с 12 февраля 2018 г. по 30 апреля 2018 г. включительно:**

9.1. Быть или стать держателем **зарплатной карточки Mastercard, эмитированной ОАО «Белгазпромбанк».**

9.2. Совершить безналичную операцию по оплате с использованием **зарплатной карточки Mastercard** товаров (работ, услуг) в объектах торговли и сервиса, на сумму безналичной операции не менее **30,00 (тридцати)** белорусских рублей.

9.3. Заполнить регистрационную форму, которая содержит обязательные для заполнения поля, на интернет-сайте igra.belgazprombank.by (далее – Сайт), указав:

1. фамилия, имя и отчество (полностью) Участника;

2. почтовый адрес Участника (почтовый индекс, населенный пункт, улица, дом, корпус (при наличии), номер квартиры (при наличии);

3. личный номер телефона в формате – код оператора или междугородний телефонный код населенного пункта, номер абонента (пример – +375 29 789-63-67, где 29 – код оператора (населенного пункта), а 7896367 – номер абонента, без пробелов и символов);

4. адрес электронной почты (e-mail);

5. данные о безналичной операции:

а) дата операции (дата совершения безналичной операции – согласно соответствующему карт-чеку);

б) код авторизации безналичной операции (код авторизации, подтверждающий осуществление банком-эмитентом авторизации. Состоит, как правило, из 6 цифр и печатается на карт-чеке);

в) первые шесть цифр и последние четыре цифры номера зарплатной карточки Mastercard, с помощью которой была совершена безналичная операция;

г) сумма безналичной операции.

6. Ознакомиться с настоящими Правилами проведения Рекламной игры, поставив галочку об ознакомлении с Правилами проведения Рекламной игры и о согласии на участие в Рекламной игре в регистрационной форме.

Каждая зарегистрированная безналичная операция на сумму от 30,00 (тридцати) белорусских рублей будет участвовать в розыгрыше 100,00 белорусских рублей. **Каждый Участник может выиграть не более одного денежного приза в 100 BYN.**

9.4. Каждой зарегистрированной безналичной операции, совершенной с использованием зарплатной карточки Mastercard, номиналом не менее 30,00 белорусских рублей присваивается Игровой Номер Участника с первого разряда (0000001, 0000002, 0000003, 0000004 и т. д.). Данный Игровой Номер присваивается по дате и времени регистрации на сайте Участником безналичной операции 30,00 рублей и выше и является основанием для участия в розыгрыше приза, при соблюдении Участником Рекламной игры условий настоящих Правил. Присвоенный Участнику Игровой номер вносится в Список Участников Рекламной игры в порядке возрастания от меньшего к большему.

10. Соблюдать нормы законодательства Республики Беларусь и правила пользования банковскими платежными карточками, установленными банком-эмитентом.

11. Регистрация новой безналичной операции с использованием зарплатной карточки Mastercard осуществляется через заполнение новой регистрационной формы на Сайте.

12. В случае если одна и та же безналичная операция с использованием зарплатной карточки Mastercard будет зарегистрирована на Сайте более одного раза, она будет приниматься для участия в розыгрыше только один раз по факту первой регистрации данных безналичной операции в регистрационной форме Сайта и участвовать в розыгрыше на основании такой регистрации. Повторная регистрация одной и той же безналичной операции с использованием зарплатной карточки Mastercard не принимается к участию в розыгрыше.

13. Не допускаются к участию в Рекламной игре безналичные операции, которые:

не зарегистрированные на Сайте;

совершены с использованием зарплатной карточки **до** 00.00 12.02.2018 года или **после** 23.59.59 30.04.2018 года;

совершены операции по снятию наличных денежных средств или пополнению счета;

совершены операции, проведенные в кассах отделений и каналах дистанционного банковского обслуживания банков;

совершены посредством форм услуг дистанционного банковского обслуживания «Интернет-банк», мобильное приложение BGPB Mobile, SMS-управление ОАО «Белгазпромбанка»;

совершены операции перевода денежных средств с/на зарплатную карточку Mastercard.

**14. Порядок розыгрыша, уведомления Победителей о результатах розыгрыша и вручения призов.**

14.1. Розыгрыш призов состоится 15 мая 2018 года в присутствии комиссии по проведению Рекламной игры в 10.00 по адресу: Республика Беларусь, РУП «Отель «Минск», г. Минск, пр-т Независимости, 11/2, офис 328, среди участников Рекламной игры, выполнивших условия настоящих Правил.

14.2. Розыгрыш призового фонда проводится открыто с возможностью присутствия на нем участников Рекламной игры. Результаты розыгрыша Рекламной игры не должны зависеть от воли Организатора и не могут быть никем специально устроены.

14.3. Определение выигрышных номеров призов происходит следующим образом:

для проведения розыгрыша используется лототрон и набор шаров в количестве 10 штук с номерами от 0 до 9. Определение выигрышных Игровых Номеров происходит путем их формирования слева направо из номеров шаров, поочередно извлекаемых из лототрона. Розыгрыш начинается с первого разряда слева.

В лототрон Организатором загружаются шары с номером от 0 по цифру, соответствующую первому разряду последнего зарегистрированного Игрового Номера. Шары перемешиваются, и из лототрона извлекается шар, номер которого определяет цифру первого разряда выигрышного Игрового Номера. Номер шара вносится в протокол.

Далее в лототрон загружаются те номера шаров, которые существуют по сверенному списку Игровых Номеров в соответствующем разряде. Шары перемешиваются, и из секции лототрона извлекается шар, номер которого определяет цифру соответствующего разряда выигрышного Игрового Номера. Номер шара вносится в протокол.

Для определения последующих разрядов 3, 4, 5, 6, 7 выполняются те же действия. Номера шаров вносятся в протокол.

**Выигравшим Приз считается первый Игровой Номер, определенный согласно п. 14.3, и каждый 100 (сотый), следующий за ним в Списке, в количестве 999 Игровых Номеров. Всего 1 000 (тысяча) призов. Каждый Победитель получает денежный приз в 100 BYN.**

**Каждый Участник может выиграть не более одного денежного приза в 100 BYN. В случае повторного попадания на уже Победившего Участника выигрышным считается следующий по списку Игровой Номер иного Участника.**

В случае если выигрышный Игровой Номер попадает на конец списка, то дальнейшее исчисление продолжается с начала списка.

14.4. Победители уведомляются одним из следующих способов по усмотрению Организатора: по электронной почте или письменно заказным письмом с уведомлением до 21 мая 2018 г.

Все призы до 15 июня 2018 г. (включительно) будут перечислены Победителям на **зарплатные карточки Mastercard, эмитированные ОАО «Белгазпромбанк»**, участвующие в Рекламной игре.

14.5. Призы не подлежат замене.

14.6. При получении призов Победители несут все права и обязанности по уплате подоходного налога в бюджет Республики Беларусь. Начисление, удержание и перечисление подоходного налога проводится в порядке, установленном Особенной частью Налогового кодекса Республики Беларусь.

14.7. Ответственность Организатора по выдаче призов ограничена исключительно вышеуказанным количеством и видами этих призов.

14.8. В случае невыполнения Победителями настоящих Правил в выдаче приза может быть отказано.

**15. Наименование печатного издания средства массовой информации для публикации Правил и результатов розыгрыша, сроки публикации.**

15.1. Правила Рекламной игры подлежат публикации в газете «Звязда» до начала Рекламной игры.

15.2. Результаты розыгрышей Рекламной игры подлежат публикации в газете «Звязда» не позднее 12.06.2018 г.

**16. Права и обязанности участников Рекламной игры.**

16.1. Принимая участие в Рекламной игре, Участники Рекламной игры подтверждают свое ознакомление и согласие со всеми условиями настоящих Правил, а также принимают на себя обязательство выполнять все требования настоящих Правил и законодательства Республики Беларусь, вытекающие из участия в Рекламной игре и/или связанные с получением призов.

16.2. Факт участия в Рекламной игре подразумевает, что ее участники соглашаются с тем, что в рамках данной Рекламной игры их имена, фамилии, отчества, фотографии, аудио- и видеоинтервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в рекламных целях, связанных с проведением и результатами данной Рекламной игры, в том числе по радио, телевидению, в глобальной компьютерной сети интернет и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты им какого-либо вознаграждения в рамках данной Рекламной игры. Все права, в том числе исключительные имущественные права, на такие интервью и результаты съемки будут принадлежать Организатору.

16.3. Участники Рекламной игры при заполнении регистрационной формы на Сайте обязаны вводить достоверную информацию. Организатор не несет ответственности за достоверность данных, внесенных участниками в регистрационную форму, а также за последствия внесения участником недостоверной информации в регистрационную форму.

**17. Порядок предоставления информации по вопросам проведения Рекламной игры.**

17.1. Все возможные вопросы и претензии участников в отношении организации и условий передачи Призов должны быть адресованы Организатору Рекламной игры по адресу: 220030, Республика Беларусь, г. Минск, пр. Независимости, 11/2, офис 328.

17.2. Информацию об условиях участия и проведения Рекламной игры можно получить по телефону 120, а также на сайте igra.belgazprombank.by.

17.3. Организатор не вступает в споры между участниками Рекламной игры относительно определения собственника выигранного приза и/или претендентов на получение приза.

**18. Иные условия.**

18.1. Споры между Организатором и участниками Рекламной игры рассматриваются согласно законодательству Республики Беларусь.

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3199 от 31.01.2018 выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь

# «ГЭТА ПЁК НАШ ТАТА!»



Руслан раіць усім бацькам гатаваць разам з дзецьмі.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

***— Што датычыцца масажу... Дзе аваладвалі майстэрствам?***

— Масаж я асвоіў пасля нараджэння другога дзіцяці, якое не спала начамі. Памятаю, гушкаеш-гушкаеш, а яму ад гэтага толькі горш. Аказалася, Косціку проста балеў жывоцік. Ёсць цудоўны рэсурс am-am.info, прысвечаны грудному выкормліванню. На гэтым сайце нам параілі відэаролік, дзе масажыст са стажам паказвае, як і куды правільна націскаць. Паспрабаваў, атрымалася і дапамагло.

***— Вы з жонкай — партнёры ў сямейнай пякарні. Цікава, а як ставіцеся да папулярных цяпер партнёрскіх родаў?***

— Я прысутнічаў пры нараджэнні ўсіх траіх дзяцей. Цудоўна, што ёсць магчымасць у такі важны момант падтрымаць самага блізкага чалавека. Для Алены было важна, каб я знаходзіўся побач. Калі дзіця, якое толькі нарадзілася — такое зморшчанае, малюсенькае — кладуць табе на рукі, гэта, паверце, імгненна абуджае бацькаўскія пачуцці.

## «Хтосьці шукае выратаванне ў бутэльцы, а я пёк, пёк, пёк...»

***— А як атрымалася, што медыцынскі псіхолаг перакваліфікаваўся ў пекара сямейнай пiраговай?***

— Кожны мужчына рана ці позна задае сабе пытанне: хто ён, чаго дасягнуў у жыцці? На той момант, калі я працаваў па спецыяльнасці, у псіхолагаў былі невялікія зарплаты. Сям'ю на такія грошы пракарміць нерэальна. Таму ўладкаваўся менеджарам па продажах. Праўда, вельмі хутка зразумеў, што гэтае «купіў танна — прадаў дорага» не прыносіць мне аніякага задавальнення. Так склалася, што маё звальненне супала з аперацыяй. Пасля выпіскі з бальніцы ў нашай сям'і былі фінансавыя цяжкасці, але хацелася чагосьці салодзенькага да гарбаткі. Знайшоў на кухні аўсянку і на аснове яе вырашыў штосьці прыгатаваць. У выніку спроб і памылак падабраў выдатны рэцэпт аўсянага пячэння, у якім усяго пяць інгрэдыентаў. Зараз пакажу *(шукае здымкі на мабільным тэлефоне)*. Гэта — аўсянае пячэнне з імбірам, гэта — з кунжутам. А вось шакаладнае з міндалем, яно больш за ўсё падабаецца маім дзецям.

...Хтосьці падчас крызісу сярэдняга ўзросту ходзіць у трэнажорку ці прыкладваецца да бутэлькі, а я пёк, пёк, пёк. Выпечка стала псіхалагічнай дапамогай самому сабе. Сябры, пасля таго, як пакаштавалі маё аўсянае пячэнне ў нас дома, сказалі: «А давай ты нам спячэш!» З гэтага ўсё і пачалося. Я дарыў ім пячэнькі, яны мне — грошы.

**«Калі дзіця, якое толькі нарадзілася — такое зморшчанае, малюсенькае — кладуць табе на рукі, гэта, паверце, імгненна прабуджае бацькаўскія пачуцці».**

***— Руслан, але ж далёка не кожная жанчына гатовая падтрымаць рызыкоўную ідэю свайго мужа. Большасць на месцы вашай жонкі сказалі б: «Што за глупства ты прыдумаў?! Ідзі ў офіс і, як усе нармальныя людзі, зарабляй грошы!» Тым больш, як вы казалі, Алена на той момант толькі нарадзіла другое дзіця, знаходзілася ў дэкрэце...***

— Алена — гэта мая апора. Як і я яе. Без жонкі ні пячэння, ні пірагоў — нічога не было б.



Галоўная фішка пірагоў Пісарэнкаў — крыху цеста і вельмі шмат смачнай і карыснай начынкі.

***— А як узнікла ідэя з пірагамі?***

— Рэцэпт бездражджавога цеста для пірагоў мне падарыла цешча, я яго толькі крыху трансфармаваў. А сама ідэя выспявала яшчэ са студэнцкіх часоў. Памятаю, мне надакучыла пераплачваць у піцэрыі за «блінчык», на які нацерусілі крыху начынкі. Таму дома тонка раскатваў цеста, на якое накладваў «шапку» ўсемагчымых інгрэдыентаў. Тоўсты слой вяндліны, памідораў, перчыку... Зверху ўсё гэта шчодра пасыпаў сырам. Атрымлівалася піца (хоць піцай гэта складана назваць) два сантыметры вышынёй. Сёння гэта галоўная фішка маіх пірагоў — крыху цеста і вельмі шмат смачнай і карыснай начынкі.

***— Вы печаце пірагі з больш чым 30 начынкамі. А якая з іх ваша любімая?***

— Кожны пірог па-свойму цудоўны *(задумваецца)*. Соня вельмі любіць чорныя парэчкі са сметанковым сырам. Косцік — вішню з міндалем. Што датычыцца мяне, то, напэўна, усё ж такі шпінатны з пяццю відамі сыроў. З салодкіх — тваражны.

***— Проста тваражны?***

— У мяне няма проста пірага. Ніводнага. Усе з «разыначкай». Вось нядаўна распрацаваў рэцэптуру для новага: да бараніны дадаў курагу, чабор, пятрушку, адыгейскі сыр. Я падбіраю максімальна якасныя прадукты. Ужо ведаю, дзе найлепшы сыр ці вяршкі. У маім пірагу вы не знойдзеце малака, тэрмін прыдатнасці якога год. Калі вяршкі, то не ніжэй за 32 % тлустасці. Моркву, гарбузы, цыбулю, яйкі, клубніцы, чорныя парэчкі набываю ў правераных фермераў. Хочацца людзям прапанаваць здаровую і смачную альтэрнатыву таму, што ёсць у крамах. Бо там сёння, на жаль, складана знайсці выпечку без пальмавага алею, эмульгатараў, стабілізатараў ды кансервантаў.

***— Мяркуючы па здымках, вы да кожнага пірага ставіцеся, як да твора мастацтва?***

— Можна і так сказаць. Кожны пірог — гэта скульптура. А такія цудоўныя фотаздымкі — справа рук маёй Алены. Наогул жонка — мозг усяго праекта. Яна бурліць ідэямі, піша, фатаграфуе. Я ж закупляю прадукты, пяку пірагі, разводжу. Мне падабаецца рабіць усё самому ад пачатку да канца і бачыць вынік. Не дзесьці там за гарызонтам, а тут і цяпер.

***— А жонку вы дапускаеце на кухню?***

— Алена вельмі смачна гатуе. Яна творчы чалавек, пастаянна эксперыментуе, у тым ліку і на кухні. Жонка ўмее з нічога зрабіць «цукерачку». Галінку размарыну якую-небудзь дадала — і смак стравы ўжо іншы. Праўда, як вы заўважылі, кухня вельмі часта належыць мне. Бывае, што за выхадныя гатую па 40 пірагоў... Таму Алена радуецца, калі ёй удаецца падысці да пліты *(смяецца)*.

***— Як умудраецеся жыць, выхоўваць дзяцей і пячы пірагі ў адной і той жа кватэры?***

— Калі шчыра, гэта тое яшчэ выпрабаванне. У нас звычайная двухпакаёвая кватэра. Кухня аб'яднаная з залай і не зачыняецца. Адзінае шчасце — дзеці разумеюць, што калі тата працуе, яму нельга замінаць. Калі пяку пірог сабе на вячэру, абавязкова падключаю сына з дачкой. Косцік можа цеста раскатваць, яму гэта вельмі падабаецца, Соня — сыр нацерці, яйкі ўзбіць. Усім бацькам раю гатаваць разам з дзецьмі, каб яны разумелі, адкуль ежа з'яўляецца на стале.

## «Галоўнае — не тэлефоны»

***— Уявіце, што я прыйшла да вас у госці. Якія б рэчы вы мне паказалі ў першую чаргу, каб штосьці расказаць пра сябе?***

— Нажы. Часта, прыходзячы ў госці да каго-небудзь, прапануеш: «Давай дапамагу штосьці нарэзаць». І пачынаеш «рваць» каўбасу, бо нажы не рэжуць. У нас дома такой праблемы няма, бо востры нож не толькі эканоміць час. Парэжце адну палавінку цыбуліны тупым нажом, а другую вострым. Мала таго, што эстэтычна яны будуць адрозніваца, дык яшчэ і смажыцца па-рознаму.

Цяпер у нас рамонт у дзіцячым пакоі. Таму, напэўна, пакажу скрынкі з інструментамі, бо рамонт раблю таксама я. У сувязі з гэтым ён цягнецца ўжо даўно, бракуе вольнага часу. Нядаўна на выхадных пераклaдваў праводку ў пакоі. «Тата, а можна я з табой буду шпакляваць?» — папрасіў Косця. Я даў сыну шпатаць, у місачку адсыпаў шпаклёўкі. Адмераў яму ўчастак сцяны ў яго рост. А сам шпаклюю вышэй. Праз хвілін 20 вяртаюся да яго і не веру сваім вачам! Малое дзіця справілася на ўзроўні тынкоўшчыка-пачаткоўца. Толькі крыху падрапаўнаць давялося.

***— Добра, што даверылі яму такую адказную работу. Які-небудзь іншы тата, пераканана, сказаў бы: «Не замінай, малы яшчэ...»***

— Гэта мы спяшаемся. Што зусім няправільна. Усё вакол нас прыспешвае. Зніжкі: паспей купіць да канца месяца. Праграмы: хутчэй абнаві. Выпусцілі новы смартфон: будзь у трэндзе. У мяне тэлефону *(паказвае)* троы з паловай гады. Ён працуе. Навошта мне набываць новы? У тых жа самых сацыяльных сетках вялізны аб'ём інфармацыі. Калі ўсё гэта праз сябе прапускаць, у цэбе не застанецца сіл для Галоўнага. А Галоўнае — гэта сям'я: жонка, дзеці. Але ніяк не тэлефоны, планшэты ды іншыя матэрыяльныя рэчы.

**«У мяне няма проста пірага. Ніводнага. Усе з «разыначкай». Вось нядаўна распрацаваў рэцэптуру для новага: да бараніны дадаў курагу, чабор, пятрушку, адыгейскі сыр».**

***— У вас ёсць мара, якая дае вам сілы прачынаецца кожную раніцу?***

— Хацелася б з'ехаць з Мінска. Куды-небудзь у вёску, жыць у сваім доме, а не ў каменным вулеі. Летам мы здымалі жытло пад Мінскам — дык дзяцей як падмянілі. У іх з'явілася столькі спраў — і галінкі, і жучкі, і лужыны, і каменьчыкі...

Некалькі гадоў таму мне пашчасціла праходзіць стажыроўку ў Бельгіі, у тавернe, якая працуе з 1860 года. Раней яна належала прапрадзеду, прадзеду, дзеду, бацьку і зараз справу сям'і працягвае старэйшы сын. Таверна ўяўляе сабой трохпавярховы дом. На першым паверсе гаспадары прымаюць наведвальнікаў, на другім ды трэцім жывуць. Пры афармленні выкарыстаны рэчы, якія знайшлі пры рэстаўрацыі дома: чыгунныя формы для выпечкі хлеба ды пернікаў, труба, на якой ігралі продкі... Цудоўна, калі дзеці працягваюць справу сваіх бацькоў. Вось у вашай сям'і хтосьці быў журналістам? У маім родзе таксама няма медыцынскіх псіхолагаў. Тата быў лётным тэхнікам, мама — хімікам-біёлагам. Дзе пераемнасць пакаленняў? Адсюль у тым ліку ўсе нашы крызісы, дэпрэсіі. Дарослы чалавек часта не можа сябе знайсці, бо страціў карані.

***— Да апошняга вагалася: задаваць вам гэта пытанне ці не. Ведаю, што нядаўна вы амаль што наблізіліся да сваёй мары — разам са сваімі знаёмымі адкрылі пякарню ў Мінску. Але зараз зноў печаце на ўласнай кухні...***

— З былымі партнёрамі мы разышліся ў розныя бакі. Не сышліся ў меркаваннях. Мы аказаліся не гатовыя да партнёрства і да таго, якія ўмовы гэта за сабой цягнула. Таму мы з Аленай прынялі рашэнне, што выходзім адтуль. На шчасце, аўтарская рэцэптура засталася пры мне. Шкада толькі, што назва пякарні, якую прыдумаў мой сын, засталася за імі. Ну нічога, затое ў мяне з'явіўся цудоўны досвед па вядзенні сумеснага бізнесу.

***— Гляджу, вы па-філасофску ставіцеся да гэтага?***

— Так, цяпер ужо стаўлюся па-філасофску. Але спачатку было балюча. Што мне, што Алене.

***— Калі б вы былі на маім месцы, якое б пытанне задалі сабе апошнім?***

— Можна ісці? *(Смяецца.)* (Замест гадзіны мы прагаварылі амаль дзве. — **Аўт.**).

***— Цудоўна, калі цябе чакаюць, ёсць нейкія справы.***

— Калі няма, то можна і прыдумаць. Усё ж ад цябе залежыць, усё ў тваіх руках. Калі сур'ёзна, напэўна, я запытаўся б, ці хацелі б вы яшчэ што-небудзь сказаць чытачам?

***— Ці хацелі б?***

— Любіце адно аднаго. І ў любой сітуацыі заставайцеся Людзьмі. У наш час так не хапае дабрыні, цеплыні ды людскасці.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
**Фота Алены ПІСАРЭНКІ.**

■ Тыя, хто побач

# КАПІТАН СПЛЕНДЗЕР,

## або Настаўнік, з якім светла

**Памятаю самаробны плыт з пластыкавых бутэлек, які павольна рухаўся па Шчары. Шчаслівыя твары падлеткаў, песні пад гітару і адкрытую, добрую ўсмешку «капітана» ціхаходнага судна — Аляксандра Іванавіча СПЛЕНДЗЕРА. На тым плыце было прасторна і ўтульна, панавала атмасфера згуртаванасці і сапраўднага сяброўства — адзін за ўсіх і ўсе за аднаго...**



З той пары прайшло 12 гадоў... І вось заходжу ў спартыўную залу Дабрамысленскага дзіцячага сада-сярэдняй школы — а з натоўпу хлапчукоў і дзяўчынак, якія гулялі ў валейбол, да мяне лёгкім подбегам накіроўваецца настаўнік фізкультуры. Усмешка — на ўвесь твар. І ў ёй, і ў вачах — свята!

Аляксандр Іванавіч з кагорты настаўнікаў, што аддаюць сябе ўсяго без астатку справе. Ён не проста прывівае ахвоту да здаровага ладу жыцця, а лепіць з кожнага са сваіх выхаванцаў асобу: не такую — «я лепшы за ўсіх», а спагадлівага чалавека.

Настаўнік фізкультуры не хавае, што, калі яму было гадоў сем, спрабаваў курыць. Але неяк раз бацька застукаў і «пачаставаў» рэменем. «З усёй нашай кампаніі ў сем чалавек перапала толькі мне. У той дзень я кінуў курыць, як адрэзала». А за ім і ўсе яго сябры. Хоць ні ростам, ні сілай Саша не вызначаўся сярод сваіх аднагодкаў, у ім жыў-такі лідар. І пацвярджэнне таму адзін выпадак. Неяк ён знайшоў на даху бацькоўскага дома стары сшытак, а ў ім дзіцячай рукой: «Спляндзер Саша — камандзір, Бірыч Саша — наместнік камандзіра, Макарэвіч Юра — сяржант», а за імі — прозвішчы радавых.

Да спорту мой суразмоўца прыкіпеў з дзяцінства. «Ніхто не прымушаў. Дзяцей, моладзі многа ў вёсцы было. Старэйшыя хлопцы гулялі ў валейбол, а мы, дзятва, назіралі, хварэлі, — успамінае Аляксандр Іванавіч. — Потым пачалі ствараць сваю каманду. У пятым класе ў нас было ўсё па-сапраўднаму: форма з нумарамі і надпісам «Чайка» (так называлася наша каманда). На роварах ездзілі па вёсках, гулялі з іншымі хлопцамі».

Калісьці камандзір Спляндзер давёў да паспяховага выніку сваю дваровую каманду. Стаўшы настаўнікам, сістэмна рыхтуе школьную. Дарэчы, толькі ў Дабрамысленскай школе штогод праводзіцца раённы валейбольны турнір памяці Уладзіміра Высоцкага.

У спартыўнай школьнай зале па вечарах збіраюцца вучні Аляксандра Іванавіча. Па выхадных прыходзяць яшчэ і тыя, хто скончыў школу і прыехаў праведаць бацькоў. Іх усіх цягне да настаўніка. І хоць ён па характары здаецца чалавекам, які і мухі не пакрыўдзіць, педагагічныя прыёмы ўмее прымяняць па-майстэрску.

— Напачатку трэба дзіця ўцягнуць у спорт, каб яно без яго жыць не магло, а тады ўжо ставіць пытанне выбару рубам: «Даю табе два тыдні на роздум. Ты можаш курыць, але тады мы вымушаны будзем развітацца, я не магу даваць двайную нагрузку на тваё сэрца, а кінеш — буду рады бачыць цябе». І калі такі хлопец робіць правільны выбар, я сапраўды рады ад душы, — кажа Аляксандр Іванавіч і дадае. — У наш час настаўніка ацэньваюць выключна па дыпломах яго вучняў. На мой погляд, гэта не зусім правільна. Увогуле, канчатковы вынік нашай працы можна ўбачыць не адразу. Тое, што настаўнік заклаў падмуркам, змог прывіць, іншы раз адгукаецца праз дзесяцігоддзі.

За плячамі «спляндзераўцаў» — сем водных паходаў па Шчары, 16 веласіпедных і пешых — больш чым два з паловай дзясяткі. І гэта без вылазак на два дні — толькі шматдзённыя, да якіх патрабуецца сур'ёзная падрыхтоўка. Пасля такога адчуеш сябе сапраўдным мужчынам і вынослівай, загартаванай, дзяўчынай, а не беларучкай.

На гэты год у планах настаўніка — дайсці да Нёмана. І плыт будзе будавацца па новых чарцяжах. У аснове каркаса — не бутэлькі, а пенапласт. Дарэчы, у камандзе Спляндзера заўсёды дырэктар школы, зяць, унук, выпускнікі...

У школе ён не толькі на занятках фізкультуры. Аляксандр Іванавіч — першы памочнік і ў рамонтных работах. Летась спартыўную залу прывёў у парадак: столь, сцены, падлогу памянялі. І афармленне ў школе — усе стэнды, фігуркі птушак — гэта яго рук справа. Дзіву даешся, колькі талентаў у адным чалавеку. Іх адзначае **дырэктар школы-дзіцячага садка Міхаіл Канстанцінавіч КАЗЛОЎСКІ**: «Аляксандр Іванавіч ужо тры гады на пенсіі. Школе ён аддаў 40 з лішкам гадоў. І не страціў радасці ад працы. У свой час ён вёў урокі музыкі, малявання, працы, чарчэння... Цяпер нагрузка ў Аляксандра Іванавіча паменшала — толькі урокі фізкультуры. Але ён усё ўспрымае спакойна, умее радавацца жыццю».



Што цікава, у Гродзенскі фізкультурны тэхнікум Аляксандр паступіў за кампанію з сябрамі. Актыўнага, перспектыўнага выпускніка чакала бліскучая кар'ера, а той выбраў вёску. Без прыроды ён не ўяўляе жыцця. І потым, калі адвучыўся завочна ў Брэсцкім педінстытуце на фізкультурным факультэце, колькі разоў яму прапаноўвалі пасаду дырэктара школы, старшыні сельвыканкама, а ён зноў — «не маё».

— Увосень раніцай да работы люблю прабегчыся па лесе — пазбіраць грыбы, — кажа ён. — Прырода дае столькі радасці. Хочацца працаваць, жыць, любіць!..

Колькі дамоў-«лялек» ён мог зрабіць сваімі залатымі рукамі! Колькі грошай зарабіць, але філасофія Аляксандра Іванавіча — не гнацца за раскошай і багаццем. У дом, які атрымаў ад школы, уклаў душу, лазню зрабіў, сад пасадзіў... — чалавеку не так многа трэба. Ён больш радуецца таму, што дзеці, якія нарадзіліся дзень у дзень, толькі з розніцай у пяць гадоў, выраслі добрымі людзьмі, што ўнукі прадаўжаюць пачатае.

— Сын любіць рэчку, лес, — кажа Аляксандр Іванавіч. — Купілі яму ў вёсцы домік, дык ён не вылазіць адтуль. Я рублю лазні сабе, дачцэ, сябру, брату... І сын плануе паставіць, хоць часу ў яго няшмат. Прыемна, што ўнук у сваёй кватэры сам рамонт робіць. Не дарэмна я жыццё пражыў.

Гэта так. Яго клічуць людзі дапамагчы штосьці будаваць, рабіць. Ён не адмаўляе. Але за сваю работу грошай не бярэ. Па нашым часе гэта зноў жа неверагодна, таму каштоўна ўдвая. З лета ён шчыруе ў храме. І знайшлі тут адушыну не толькі яго залатыя рукі, але і душа.

— На службе стаю і часу не заўважаю, хоць у савецкі час дзяжурыў, каб дзеці не ішлі ў царкву, — прызнаецца ён і дадае з надзеяй. — У званы званю. Гэта не такая і простая справа, трэба ўсё пад рытм малітвы падбіраць. Мне па душы. Лёгка становіцца...

Слухала настаўніка і думала: «Інакш і не магло быць. Бог адорвае шчодра талентамі не кожнага, а таго, хто здольны несці гэты дар людзям».

**Валянціна БОБРЫК.**
*Івацэвіцкі раён.*
**Фота Валерыя МІСКЕВІЧА.**

■ Не прапусціце!

# Намаляваць любімага героя ды зняць буктрэйлер

## Прапаноўваюць дзецям арганізатары новай «кніжнай» акцыі

**Яна — «Культурны маршрут «Мая Беларусь: сучасныя пісьменнікі — дзецям» — стартуе на міжнароднай кніжнай выстаўцы, якая пройдзе ў Мінску напрыканцы лютага. Але падрыхтоўка да яе ідзе ўжо зараз, прычым поўным ходам.**

— Мы хочам, каб акцыя была нефармальная, яркая, цікавая ды запамінальная, — кажа **кансультант упраўлення выдавецкай дзейнасці і гандлю Міністэрства інфармацыі Беларусі Людміла БЫКАВА**. — Галоўная мэта, якую мы перад сабой ставім, — пазнаёміць хлопчыкаў і дзяўчынак з рэгіёнаў з сучаснымі беларускімі дзіцячымі пісьменнікамі, іх творамі, абудзіць у малых жаданне чытаць.

— Больш за тое, мы хочам зрабіць з дзетак актыўных чытачоў, — дадаў адзін з арганізатараў акцыі, **пісьменнік, галоўны рэдактар часопісаў «Вясёлка» і «Буся» Уладзімір ЛІПСКІ**. — Каб яны не толькі «глыталі» цікавыя кнігі, але і ахвотна дзяліліся сваімі ўражаннямі ад прачытанага, давалі зваротную сувязь пісьменнікам. Мы з радасцю будзем змяшчаць найлепшыя дзіцячыя водгукі на старонках «Вясёлкі», «Бусі».

Дарэчы, **дырэктар выдавецтва «Пачатковая школа» Вольга ВАНІНА** таксама паабяцала пасля таго, як стартуе акцыя, распачаць адпаведныя рубрыкі ў рускамоўных часопісах для дзяцей «Рюкзачок» ды «Рюкзачишка».

Да акцыі падключыліся з дзясятак беларускіх выдавецтваў (у тым ліку і наш «Выдавецкі дом «Звязда»). Кожнае падабрала кнігі (сярод якіх, што прыемна, пераважная большасць на беларускай мове), якія могуць зацікавіць дзяцей малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту. Менавіта яны ўвойдуць у склад «чароўных заплечнікаў», што разам з віктарынамі ды конкурсамі прыхопяць з сабой у рэгіёны дзіцячыя пісьменнікі. Сярод іх Алесь Карлюкевіч, Уладзімір Ліпскі, Алесь Бадак, Раіса Баравікова, Генадзь Аўласенка, Алена Масла і іншыя...

Спіс раёнаў, куды завітаюць пісьменнікі, таксама адкрыты. Ужо ёсць дамоўленасць з Любанскім, Дзяржынскім, Рэчыцкім, Калінкавіцкім. «Хацелася б, каб далучаліся і іншыя, — падкрэсліла Людміла Быкава. — Мы адкрытыя да кожнай ініцыятывы».

Арганізатары разумеюць, што плакатам сучасных дзяцей не здзівіць, таму актыўна выкарыстоўваюць мультымедыя.

Паводле слоў **намесніка галоўнага рэдактара часопіса «Вясёлка» Настассі РАДЗІКЕВІЧ**, «чароўны заплечнік» будзе не толькі рэальны, але і віртуальны. Дзеці могуць атрымаць яго, не выходзячы з дому. Акрамя таго, мы прапануем старэйшым удзельнікам акцыі зрабіць буктрэйлеры (кароткія відэаролікі з уражаннямі пра кнігу). Змясціць апошнія можна будзе пад адмысловым хэштэгам у сацыяльных сетках.

Пераможцам рыхтуюцца прыемныя падарункі. У прыватнасці, яны прымуць удзел у Дні беларускага пісьменства, які пройдзе ў Іванаўскім раёне. Акрамя таго, верагодна, што лепшыя з лепшых атрымаюць пуцёўку ў летнік «Зубраня».



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Цудоўна было б, калі б сачыненні, якія дзеці напішуць падчас акцыі, зніталіся ў асобную кнігу. Да яе мог бы напісаць прадмову хтосьці з беларускіх пісьменнікаў, — падзяліўся сваімі марамі Уладзімір Ліпскі. — Наша задача натхніць юных талентаў на гэтую кніжку. А чаму б на аснове малюнкаў, якія будуць прадстаўлены на конкурс (маленькім дзеткам прапануюць намаляваць любімага героя), не надрукаваць паштоўкі?

Нягледзячы на тое, што пісьменнікі проста фізічна не паспеюць аб'ехаць да восені ўсе раёны, прыняць удзел у конкурсе могуць хлопчыкі і дзяўчынкі з усёй краіны. Падрабязную інфармацыю пра яго ўмовы шукайце на сайтах Міністэрства інфармацыі і часопіса «Вясёлка».

**Надзея ДРЫЛА.**

■ Вуснамі дзіцяці

# ДЗЕСЯЦЬ КАПЕЕК

**Я ішла пехам дадому са школы. Кожны дзень я раблю так. Да школы — тры прыпынкі. Вядома, можна пад'ехаць тралейбусам ці аўтобусам. Але там шмат людзей, цесна. А на вуліцы — прастора. Можна не спяшаючыся ісці і выдумваць розныя гісторыі. Так, так, я — фантазёрка.**

Завуць мяне Настасся Весялова. Вучуся я ў 5 «А» класе. Урокі ў школе завяршаюцца ў дзве гадзіны дня. Бацькі — на працы. Акрамя папугая Жорыка, мяне ніхто не чакае. І якая розніца, прыйду я дадому на пяць хвілін раней ці пазней.

Раптам зірнула сабе пад ногі і... мой позірк спыніўся на нечым дробным і круглым. Калі прысела, убачыла на тратуары манетку — дзесяць капеек. Не густа. Але чамусьці пакідаць яе тут не хацелася. Я падняла манетку і паклала сабе ў кішэнь.

Яна была ў мяне адна. Бо іншыя грошы я пакінула сёння ў буфеце.

«Цікава, што можна набыць за дзесяць капеек?» — падумала я.

У галаву нічога не прыходзіла. На кішэнныя расходы бацькі дадуць толькі заўтра. Магчыма, менавіта заўтра знойдзеная манетка і спатрэбілася б. Але да заўтра яшчэ далёка, а набыць штосьці смачнае хацелася цяпер. Тым больш, кіёскаў па дарозе да дома хапала.

Нечакана да мяне звярнуўся мужчына ў пакамечаным адзенні. Я нават здзівілася. Звычайна такія людзі звяртаюцца да старэйшых, выбачаюцца і кажуць, што ім не хапае на грамульку-другую.

— Прашу прабачэння, але не будзе ў вас рубля?

Відаць чалавек нават і не зірнуў на мяне: яму было ўсё адно, што перад ім стаіць школьніца.

— Не, у мяне толькі дзесяць капеек, — адказала я.

— Якая мне з іх карысць, — незадаволена буркнуў чалавек і патупаў далей.

«Сапраўды, якая карысць?» — падумала і я.

Я прыпынілася каля аднаго з кіёскаў. Стала разглядваць тавар і цэны. За дзесяць капеек і сапраўды нічога не набудзеш. Магчыма, столькі каштуюць запалкі. Але іх тут не было. І дома запалкамі ніхто не карыстаецца. А мама вельмі злуецца, калі дадому прыносяць непатрэбныя рэчы. Яна кажа, што яны псуюць інтэр'ер. І амаль кожная непатрэбная рэч тут жа апынаецца на балконе.

Звычайна, такія рэчы прыносіць бацька. Гэта ў асноўным рыбалоўныя прылады. Мяне цікавіць пытанне: «Чаму рыба, злоўленая гэтымі прыладамі, на кухні зусім не лішняя, а вось прылады — непатрэбныя ў кватэры рэчы?»

— Вырасцеш — зразумееш, — адказвае заўсёды мне мама.

Гэта адно з любімых яе выказванняў. Часам мне здаецца, яна пазбягае са мной сур'ёзных размоў. Адказаць так значна прасцей, чым бітую гадзіну тлумачыць свой пункт гледжання.

Да кіёска падышоў мужчына і папрасіў «Спартыўную панараму».

— Капейкі не знойдзецца? — запыталася жанчына-прадавец.

Мужчына перабраў у жмені манеткі. Патрэбнай не знайшлося. Прадавец незадаволена фыркнула:

— Быццам дробязь — і не грошы зусім. Нават рэшты няма чым даць. Пяць капеек буду вінна, — сказала яна пакупніку.

Той даў зразумець, што для яго пяць капеек не маюць значэння і адышоў ад кіёска.

Я ж зразумела, што дзесяць капеек — гэта дробязь, і што яна ў пэўныя моманты нават патрэбная. Але тут патрабавалася ўсяго адна капейка. І яе ў мяне не было, каб дапамагчы чалавеку.

Я падумала, хто з маіх аднакласнікаў падняў бы гэтыя дзесяць капеек? Ліза Тарасава? Наўрад ці. Яе бацька прадпрымальнік. Шторанiцы прывозіць да школы на «Ланд Крузеры». У яе самы модны мабільны тэлефон і планшэт. У буфеце набывае што заўгодна. Калі б на дарозе ляжаў і рубель, Ліза б яго не падняла. Хоць, зразумела, гэта толькі мая думка.

Хутчэй за ўсё гэтыя грошы падняў бы Вова Сямёнаў. Ён са шматдзетнай сям'і, якая знаходзіцца пад кантролем міліцыі. Але ці дапамаглі б яму дзесяць капеек? Яму не дапамог бы, мабыць, і рубель.

Цікава, што было б, калі б я кожны дзень знаходзіла па дзесяць капеек? Прыходзіла б дадому і клала іх у скарбонку. Яна ў нас ёсць. Але дагэтуль пустая. Таму што кожны трымае свае грошы пры сабе, нават самыя маленькія. Але знойдзеныя я б дакладна клала туды. Скарбонка ў выглядзе вялікага тоўстага ката. Думаю, туды змясцілася б шмат манет. Магчыма, тысяча, а то і дзве. Нават і па дзесяць капеек. Як кажуць дарослыя: "Па кропельцы — рэчка, па травінцы — копка, а па копцы — стог».

Колькі трэба знайсці манетак, каб улетку адпачыць на Мальдывах? Вось цікава. Увесь клас у летні лагер, а я адна — на Мальдывы. Ну, хіба што яшчэ Ліза Тарасава.

Да прыпынку падышла жанчына з хлопчыкам. Убачыўшы галубоў, малы засмяяўся, пабег да іх.

— Вось і наш аўтобус. Толік хадзем, — паклікала сына жанчына.

Яна пачала хутка лічыць грошы, каб разлічыцца з кіроўцам. Але штосьці пайшло не так. Жанчына патрэсла кашалёк, але з яго нічога больш не выпадала.

— Дзесяць капеек, дзесяць капеек, — пачала нервова гаварыць яна. — Няўжо няма. Няўжо прыйдзецца пехам пяць прыпынкаў. А нам у дзіцячую паліклініку паспець трэба.



Ілюстрацыя Кацярыны БАБОК.

Я зразумела: жанчыне не хапае на білет дзесяць капеек. Без іх яна спозніцца з Толікам на прыём да доктара. Людзі на прыпынку стаялі і маўчалі. Я падышла да жанчыны і працягнула ёй знойдзеныя дзесяць капеек.

— Вазьміце калі ласка, — сказала я.

Жанчына зірнула на манетку, потым на мяне, потым на манетку, хутка яе ўзяла з маёй далоні.

— Дзякуй вялікі, дзяўчынка, — падзякавала яна і ўмомант павесялела.

Жанчына хутка ўзяла хлопчыка за руку і павяла ў аўтобус.

Аўтобус ад'ехаў. Я стаяла і глядзела яму ўслед. Вось і спатрэбіліся мае знойдзеныя дзесяць капеек. Маці і хлопчык не спозняцца на вельмі важны прыём. Доктар скажа, што Толік здаровы, і яны абодва радасныя вернуцца дадому назад.

Пэўна, так было патрэбна, каб нехта згубіў гэтыя дзесяць капеек, а я знайшла. Каб аддаць іх потым чалавеку, якому яны найбольш былі патрэбныя.

Кажуць, у жыцці нічога не бывае выпадкова.

А Мальдывы? Яны пачакаюць. Бо да летніх вакацый яшчэ не адзін дзень.

**Андрэй СІДАРЭЙКА**

■

■ Фотаздымак з гісторыяй

# АЎСТРАЛІЙСКАЯ ФАБРЫКАНТКА

**«Так вось вайна «паклапацілася» пра нашы лёсы...» — уздыхае Іван Амяльянавіч Шах, жыхар вёскі Вялікія Смальяны, што за кіламетр ад райцэнтра Чашнікі, перакладваючы стосік сямейных фотаздымкаў. Вельмі прыгожая жанчына са сваімі роднымі на фоне экзатычнай прыроды. Прыгажуня, як высветлілася, стрыечная сястра майго земляка Ганна, у дзявоцтве таксама Шах.**



Ганна ў Аўстраліі.

...Ганна нарадзілася ў 1925-м на хутары недалёка ад вёскі, дзе зараз жыве брат Іван. У дзяцінстве яны часта гулялі разам. Падрасталі, марылі пра будучыню, а наперадзе была вайна і не адна.

Бацька Ганны не вярнуўся з фінскай. Родны брат Віктар, лётчык, загінуў, абараняючы ад фашыстаў Ленінград. У 1944-м акупанты забралі ў Нямеччыну Ганну. На чужбіне ад землякоў, якія прыбылі пазней, дзяўчына даведалася пра смерць маці...

Пасля вызвалення вязняў амерыканцамі Ганна трапіла ў Францыю. Амаль 30 год родныя з Чашніччыны не мелі ад яе вестак.

...Той дзень напачатку 70-х, калі паштальён уручыў яму ліст з Аўстраліі, Іван Шах будзе помніць да апошніх дзён. Няцяжка ўявіць, што перажылі сваякі, калі даведаліся, ад каго пасланне. Пісала Ганна. Жанчына расказвала пра свой пасляваенны лёс. Спачатку жыла ў Францыі. Там беларуска-прыгажуня пакарыла сэрца мільянера, стала яго жонкай, але не задалося...

Ганна вырашыла шукаць долі за акіянам і адправілася ў Аўстралію. На невядомай паўднёвай зямлі яе найлепшыя надзеі спраўдзіліся. Падарункам лёсу лічыла сустрэчу з Жанам Лавазаніянам — хлопцам-армянінам, бацькі якога былі выхадцамі з Расіі. З ім беларуску напаткала сапраўднае сямейнае шчасце. У пары нарадзілася двое дзяцей, жылі заможна. «Розум Жана, — пісала Ганна, — і наша агульная працавітасць дапамаглі стаць фабрыкантамі». Лавазаніянам належала фабрыка лайкавых пальчатак.




2016-ы — Карын Кнап *(злева)* з беларускімі сваякамі на Чашніччыне.

Яны шмат вандравалі па свеце, але туга па радзіме не пакідала Ганну. Муж, як мог, імкнуўся суцешыць. Пры магчымасці абавязкова ішлі на канцэрты артыстаў з Саюза. Ганна марыла пра паездку на радзіму.

Здзейсніць запаветнае атрымалася толькі ў 1975-м. Лавазаніяны прыехалі ў Мінск і пасяліліся ў гасцініцы «Інтурыст». Законы ў адносінах да іншаземцаў у тыя часы былі вельмі строгія. Без адпаведных дакументаў выехаць на Чашніччыну аўстралійцы не маглі. Лавазаніяны іх не мелі. Запрасілі чашніцкіх родных у сталіцу, дзе і адбылася першая сустрэча. Так і паехала б Ганна, не ўбачыўшы мясцін свайго дзяцінства, каб не выпадковае здарэнне.

Маленькі сын Лавазаніянаў — Рыкі — гуляў у футбол у двары «Інтурыста» з хлапчукамі, якія пражывалі ў гасцініцы. У нейкі момант мячык ад удару юнага футбаліста ўзляцеў высока ўверх і, пакінуўшы межы спартыўнай пляцоўкі, даляцеў да акна пакоя, дзе размясціліся аўстралійцы. Звон разбітай шыбы нарабіў шмат шуму.

Шкліць акно ў прысутнасці замежных гасцей супрацоўнікам гасцініцы забаранілі. Але выйсце было знойдзена: Лавазаніянам прапанавалі паехаць на Чашніччыну. З гэтай нагоды сям'і выдзелілі «Волгу» чорнага колеру і суправаджэнне ў асобе афіцэра КДБ. Так больш чым праз 30 гадоў Ганна змагла пабываць на малой радзіме. Усяго некалькі дзён правяла яна ў беларускай вёсцы. Чым яны сталі для жанчыны — можна здагадацца.

Мінула ўжо дзясяцігоддзе, як не стала Ганны. Але сувязі з Беларуссю яе сям'я не страціла. Вельмі дапамагае інтэрнэт. Не так даўно ў Вялікіх Смальянцах сустракалі ўнучку Ганны — Карын Кнап. Дзяўчына працуе ў адной са швейцарскіх фірмаў. Службовыя справы прымусілі адправіцца на ўсход Расіі. Абмінуць Беларусь не змагла. Цёплая сустрэча вельмі ўразіла аўстралійку. Яна абяцала абавязкова прыехаць яшчэ...

**Ірына ТОРБІНА,**
*г. Чашнікі.*

***Шаноўныя чытачы! Конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома. Здымкі (не больш за тры) з невялікай гісторыяй дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск або info@zviazda.by. Найлепшага аўтара чакае прыз. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца***

■



1975-ы — сям'я Лавазаніян на радзіме Ганны ў Вялікіх Смальянцах.




# ГАСПАДЫНЬКА З ТУРОЎ

Дзяўчынку, якую вы бачыце на гэтым здымку, завуць Віялета Труханові́ч. Родам яна з палескай вёсачкі Туры. У свае восем гадоў Віялета дапамагае матулі прыбіраць у хаце, даглядаць свойскіх жывёл, спрабуе гатаваць розныя стравы. Гэтая маленькая беларусачка вельмі любіць сваю Радзіму і марыць пабываць у Сафійскім саборы.

***Шаноўныя мамы і таты, бабулі і дзядулі! Конкурс «Беларусікі» працягваецца. Дасылайце здымкі вашых дзетак, унукаў, а можа, нават і праўнукаў (з невялічкім аповедам) на адрас «Звязды». Але адна ўмова — каб, зірнуўшы на фота, адразу ж можна было зразумець, што гэта беларусік. Арыгінальнасць і творчы падыход вітаюцца! Аднаго з герояў, якога мы ўбачым на здымках, чакае прыз!***

# ЗІМОВЫЯ ЗАБАЎКІ...

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)***

Калі за акном змрочна і дзіця не хоча выходзіць на вуліцу, прапануйце яму надзець **акуляры з аранжавымі ці жоўтымі шкельцамі.** Шэры дзень адразу стане сонечным і вясёлым.

Зацікаўце дзіця незвычайнымі прадметамі, якія можна ўзяць з сабой на вуліцу: **бінокль, лупа, ліхтарык...**

Калі на вуліцы ідзе снег, звярніце ўвагу дзіцяці на тое, якая прыгожая і непаўторная кожная падаючая сняжынка. Для гэтага яе трэба злавіць на які-небудзь цёмны фон — рукавіцу або аркуш чорнай паперы — і разгледзець праз лупу. Таксама сняжынку можна сфатаграфаваць і даследаваць, павялічыўшы выяву.

З біноклем на шпацыры вы заўсёды знойдзеце аб'ект для назірання: катоў, сабак ці птушак. А ліхтарык спатрэбіцца, калі на вуліцы ўжо сцямнее, бо вяртацца дадому, асвятляючы шлях, нашмат цікавей.

**Не спяшайцеся хаваць летнія цацкі.** Яны спатрэбяцца вам і для зімовых прагулак. Дзецям будзе асабліва цікава гуляць з імі — бо, уявіце сабе, на дварэ зіма, а яны з сачком у руках!

**Сачком** можна лавіць мыльныя бурбалкі. А яшчэ ім можна гуляць: кідайце ў сачок дзіцяці снежкі ці шышкі, называючы пры гэтым ядомыя і неядомыя прадметы. Адны ён павінен злавіць, а другія — прапусціць.

Пакладзіце абруч на снег або павесьце яго на дрэва. Ён будзе цудоўнай мішэнню. Кідаць у яго можна тыя ж самыя снежкі, шышкі або мячыкі.

З **мячыкам**, дарэчы, можна пагуляць у слоўныя гульні. Кідайце адно аднаму мяч і пры кожным кідку дадавайце да слова кідаючага сваё: зіма — холадна — санкі — снег — рукавіцы...

Прыдумайце для прагулкі цікавае заданне або даручэнне. Напрыклад, **пакарміць птушак.** Калі ў вас побач з домам няма кармушкі, то самы час змайстраваць яе сваімі рукамі. Найбольш просты варыянт з пакунка з-пад соку ці малака. Можна зрабіць некалькі такіх кармушак і развесіць іх у суседнім парку. А потым абыходзіць усе і дасыпаць у іх зярняткі. Так у вас будзе і больш-менш працяглы маршрут, і мэта прагулкі.

### Гульня «Пошук скарбу»

Вам трэба будзе загадзя купіць у краме «скарб». Гэта можа быць пачастунак (маленькая шакаладка, цукерка), цацка або сувенір. «Скарб» трэба пакласці ў непрамакальны пакецік і схаваць пад снегам у пэўным месцы. Дзіця павінна яго знайсці, кіруючыся вашымі падказкамі. Падказкі могуць быць простыя, напрыклад, гарача-халадна ці больш складаныя: зрабі два крокі налева, потым тры крокі наперад і г. д. Для старэйшых дзетак можна намаляваць адмысловую карту з заданнямі.

### Цацкі з каляровага лёду

Увечары заліце падфарбаваную (харчовымі фарбавальнікамі) ваду ў формачкі рознага памеру. Падыдуць як сіліконавыя для замарожвання лёду, так і набор для пясочніцы. Можна выкарыстоўваць і звычайную ваду, але для прыгажосці лепш дадаць у яе ягады, кавалачкі апельсіна, яловыя галінкі. Перад тым як паставіць формачкі ў лядоўню, не забудзьце пакласці ў кожную па пяцельцы з нітак — каб гатовыя фігуркі можна было развесіць на галінках дрэў у лесе або ў двары вашага дома.





Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

### Як паводзяць сябе на марозе мыльныя бурбалкі?

Спадзяюся, у нас яшчэ будзе гэтай зімой магчымасць правесці цікавы эксперымент. Калі на марозе (ад -7 °С) надзьмуць мыльную бурбалку, яна на вачах пакрыецца ледзянымі ўзорамі і ператворыцца ў хрустальны шар. Чым ніжэйшая тэмпература, тым хутчэй бурбалка замерзне. Ідэальная тэмпература для крышталізацыі -15 °С. Крыштальнымі мыльнымі бурбалкамі можна ўпрыгожыць дрэвы і кусты побач з домам.

**У моцны мароз можна зрабіць з дзецьмі і ледзяныя ліхтарыкі.** Вось самы просты спосаб: складзіце снег па крузе, утрамбавайце і потым паліваць яго вадой, каб выраслі ледзяныя сценкі. А ўнутр такога ліхтарыка можна паставіць тоўстую свечку або бенгальскі агонь.

Цікавых і карысных вам прагулак, шаноўныя чытачы. І памятайце, любую непагадзь можна расквеціць багатай фантазіяй.

**Наталля МАЎЧАНАВА.**

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ЧАСТУЙЦЕСЯ!

## «Закаханы далмацінец»

***Спатрэбіцца:*** *тварог — 800 г, цукар — 0,75 шклянкі, яйкі — 3 шт., ванільны цукар — 1 пакуначак, масла — 2 ст. л., крухмал — 3 ст. л., манныя крупы — 3 ст. л., соль — 1 дробка, мука — 2 ст. л., какава — 1 ст. л.*

Для ўпрыгожвання: шакалад белы — 50 г, вяршкі — 2 ст. л., шакалад цёмны — 20 г.



Тварог узбіваем у блэндары, дадаўшы жаўткі, цукар, ванільны цукар, масла, крухмал, манныя крупы.

Бялкі ўзбіваем з соллю да пікаў. Асцярожна ўмешваем у тварожную масу.

Бяром 3 ст. л. тварожнай масы, дадаём муку і какаву, добра змешваем, фармуем «сэрцайкі» і «шарыкі».

Выкладваем тварожную масу ў форму для выпечкі, якую трэба засцлаць пергаментам і прамазаць маслам. У масу ўтыкаем на розную глыбіню «сэрцайкі» і «шарыкі».

Выпякаем у духоўцы пры 180 °С каля 45 хвілін. Астуджаем у форме.

На вадзяной лазні растопліваем цёмны шакалад і малюем на паперы для выпечкі шакаладныя «сэрцайкі» і «кружочкі».

Растопліваем на вадзяной лазні белы шакалад, змешваем з вяршкамі. Пакрываем тварожнік белым шакаладам і ўпрыгожваем «сэрцайкамі» і «кружочкамі».

## Салата «Царская»

***Спатрэбіцца:*** *0,5 кг філе курыцы, 300 г цвёрдага сыру, 6 яек, шклянка салодкага чарнасліву без костачак, 1 зубчык часнаку, 300 г гатовай морквы па-карэйску, паўшклянкі трохі патоўчанага грэцкага арэха, 300 г маянэзу або натуральнага ёгурту, соль, чорны молаты перац на смак, пучок пятрушкі.*



Курынае мяса адварыць у падсоленай кіпячай вадзе да мяккасці. Астудзіць, нарэзаць кубікамі. Чарнаслі́ў прамыць і, 10 хвілін патрымаўшы ў кіпені, выкласці на папяровыя сурвэткі, абсушыць. Парэзаць палоскамі. У вараных яек аддзяліць бялкі ад жаўткоў. Асобна надзерці на сырнай тарцы. Сыр натаркаваць на бурачнай, змяшаць з маянэзам і адціснутым праз прэс часнаком. Арэхі злёгку абсмажыць на сухой патэльні, змяшаць з морквай.

На плоскай талерцы раскласці чарнасліў, прамазаць маянэзам або ёгуртам, потым — курацiну, пасаліць і паперчыць, зноў маянэз або ёгурт, наступны пласт — морква з арэхамі, зверху — гатовы сырны пласт, потым бялкі. Усё прамазаць маянэзам або ёгуртам, з усіх бакоў раўнамерна засыпаць жаўтком.

Даць пастаяць гадзіну ў халадзільніку, упрыгожыць пры падачы пятрушкай — галінкамі або нарэзаным зяленівам.

ЁСЦЬ ІДЭЯ!

## СЮРПРЫЗ ДА СВЯТА



*«СУМЛЕННАСЦІ ТРЭБА ВУЧЫЦЦА Ў МАЛЕНЬКІХ ДЗЯЦЕЙ, ПАКУЛЬ ЯНЫ НЕ НАВУЧЫЛІСЯ АД НАС НЕСУМЛЕННАСЦІ» (Казімір Камейша).*

Адказная за выпуск Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

# Каб свет паэта ўбачыць і пачуць

## Музей гісторыі беларускай літаратуры ў Мінску прадстаўляе новую экспазіцыю, прысвечаную 220-годдзю Адама Міцкевіча



**УБАЧЫЦЬ і пачуць той час, калі жыў славуты паэт, можна было ў музейнай зале падобнай на гасціную, куды збіраліся на сустрэчы сябры творцы. Тут можна ўбачыць рэдкія рэчы, копіі рукапісаў і дакументаў, творы мастакоў. Пачуць — тыя ж самыя мелодыі, якія натхнялі паэта амаль два стагоддзі таму.**

— Мы назвалі новую экспазіцыю «Шляхецкія быліцы Адама Міцкевіча» — па першапачатковай назве яго знакамітага твора, — паведаміў **дырэктар музея Зміцер ЯЦКЕВІЧ.** — Такім чынам музей распачаў святкаванне 220-годдзя з дня нараджэння паэта. На працягу гэтага года юбілейныя мерапрыемствы закрануць і сядзібу «Завоссе», дзе нарадзіўся Адам Міцкевіч. Спадзяёмся, што сёлета там будзе рэкордная колькасць наведвальнікаў не толькі з Беларусі, але і з многіх краін свету.

Сабраць экспанаты для гэтай экспазіцыі было няпроста. Ёсць тут копіі рукапісу эпічнай паэмы «Пан Тадэвуш», перададзеныя з музея Міцкевіча ў Варшаве, копіі метрычнага запісу аб хрышчэнні маленькага Адама (1799 год), аб хрышчэнні маці паэта Барбары Маеўскай, запіс аб шлюбе бабулі і дзядулі. Прыкладам такіх запісаў прадстаўленыя тут рукапісныя метрычныя кнігі Ішкалдскага касцёла. Пад шклом музейнай вітрыны можна ўбачыць невялічкае люстэрка ў металічнай аправе — яно, па легендзе, належала графіні, прыгажуні Эміліі Плятэр — знаўцы беларускага фальклору, патрыёткі, удзельніцы паўстання 1830 года. Ёй Адам Міцкевіч прысвяціў свой верш «Смерць палкоўніка».

Інтэр'ер музейнай залы нагадвае шляхецкія салоны, дзе калісьці збіраліся філаматы і філарэты — удзельнікі тайнага патрыятычнага і асветніцкага руху першай чвэрці XIX стагоддзя. Мэбля, прадметы побыту, кнігі, зброя — усё гэта дапаўняе яскравымі штрыхамі шматмерны партрэт мінулага. Жывапіснае палатно Юрыя Піскуна «На Куццю» нагадвае пра зімовыя дні, калі нарадзіўся Адам Міцкевіч.




Вядомая паэма «Дзяды» прадстаўленая старым выданнем і паштоўкамі стагадовай даўніны. На паштоўках — сцэны з тагачасных тэатральных пастановак «Дзядоў».



У час адкрыцця літаратурна-мастацкай экспазіцыі.



Гучаць старадаўнія песні ў выкананні Тамары РЭМЕЗ.



Эпічную паэму "Пан Тадэвуш" Адам МІЦКЕВІЧ напісаў у Парыжы, дзе часова жыў у эміграцыі.

Паэт, этнограф, фалькларыст Кастусь Цвірка распавёў гасцям пра свае пераклады вядомых твораў Адама Міцкевіча. Ён падкрэсліў, што ўсе яго значныя паэмы, хоць і напісаны на польскай мове, але з'яўляюцца таленавітым расповедам пра гісторыю Беларусі.

Рамантычную афарбоўку шляхецкай гасцёўні надалі песні і музыка — тыя ж самыя, якія гучалі ў даўніну. Вядома, што аўтарства іх належыць Адаму Міцкевічу і кампазітару Станіславу Манюшку. Мелодыі даўніны прагучалі ў выкананні лаўрэата нацыянальнага конкурсу вакалістаў і міжнароднага конкурсу «Магутны божа» Тамары Рэмез (сапрана) і мастацтвазнаўцы Святланы Немагай (партыя фартэпіяна).

**Яўген ПЯСЕЦКІ. Фота аўтара.**

# АРТЭФАКТЫ НАПАЛЕОНАЎСКАЙ ЭПОХІ

**Нацыянальная акадэмія навук Беларусі прыме ўдзел у выстаўцы «Напалеон на Бярэзіне — міф і рэальнасць», якая пройдзе ў горадзе Мантро-Фот-Ён (Францыя) з 9 па 18 лютага. На ёй будуць прадстаўлены вынікі беларуска-французскіх археалагічных экспедыцый.**

На працягу 2012—2017 гадоў Інстытут гісторыі НАН Беларусі арганізаваў і правёў шэсць міжнародных беларуска-французскіх археалагічных экспедыцый на месцы пераправы арміі Напалеона і расійскай арміі цераз раку Бярэзіну ў 1812 годзе. У выніку даследаванняў было вывучана каля 4000 квадратных метраў плошчы ў вёсцы Студзёнка (на месцы стаянкі арміі Напалеона і бою з расійскай арміяй), упершыню зроблены спробы археалагічнай лакалізацыі мастоў 1812 года. У супрацоўніцтве з дайвінг-клубам «Марскі Пегас» і археолагамі-дайверамі Брусельскага свабоднага ўніверсітэта беларускімі археолагамі ажыццёўлены лакальныя падводныя археалагічныя даследаванні акваторыі ракі Бярэзіны.

На выстаўцы «Напалеон на Бярэзіне — міф і рэальнасць» будуць прадстаўлены вынікі археалагічных даследаванняў (экспанаты), якія былі знойдзены Інстытутам гісторыі НАН Беларусі і Цэнтрам напалеонаўскіх даследаванняў (Францыя) на месцы пераправы цераз Бярэзіну (праект «Бярэзіна»). На выстаўцы будуць экспанавацца цікавыя аб'екты напалеонаўскай эпохі з прыватных калекцый: арыгінальныя шаблі, шпагі, пісталеты, лісты, падпісаныя рукой Напалеона, а таксама карты, гравюры, карціны і рэпрадукцыі.

Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі прадставіць экспазіцыю нацыянальных беларускіх строяў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Заўсёды гатовы!

# УСІМ — «РАЎНЕННЕ НА СЦЯГ!»

**Пад такой назвай 8 лютага ў Мінску пройдзе фінал рэспубліканскага конкурсу парадна-цырыманіяльных атрадаў, прысвечаны подзвігу піянераў-герояў і 100-годдзю Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Фінал яркага дзіцячага свята, арганізатарам якога выступае грамадскае аб'яднанне «Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя» (БРПА), абяцае стаць відовішчным шоу з пляц-парадам піянераў, сцяг-шоу, паказальным выступленнем групы барабаншчыкаў і гарністаў.**

Усяго на галоўнай арэне Палаца спорту «Уручча» за званне найлепшых будуць змагацца сем зводных парадна-цырыманіяльных атрадаў з усіх рэгіёнаў Беларусі — больш за 500 піянераў, пераможцаў адборачных этапаў конкурсу.

Сваё майстэрства, усё тое, што адточвалі да дасканаласці на працягу паўгода, свежыя ідэі і навіны, змацаваныя камандным духам, піянеры прадэманструюць у шасці намінацыях: «Сапраўдны трубач» (гарністы); «Бі, барабан!» (барабаншчыкі); «Айчыне назаўжды верныя» (пляц-канцэрт); «Сцяг-шоу» (сцяганосцы); «Мы верныя піянерскаму сцягу» (сцяганосцы); «Трымаемся традыцый сваіх» (урачыстая цырымонія ўскладання).

На працягу дня для дзяцей будзе працаваць інтэрактыўная пляцоўка «Я, ты, ён, яна — Піянеры краіна». Тут кожны ахвотны зможа вырабіць піянерскае «Зубраня», паўдзельнічаць у digital-акцыі «Я люблю БРПА» і размясціць у афіцыйнай суполцы піянерскай арганізацыі ў сацыяльнай сетцы «УКантакце» пост са сваім фота пад хештэгам #ЯлюблюБРПО. Таксама можна будзе атрымаць свой шчаслівы нумар для розыгрышу фірменных сувеніраў ад піянерскай арганізацыі і зрабіць крэатыўную фатаграфію са святочнай атрыбутыкай у піянерскай фотазоне. Пераможцы і прызёры будуць вызначаны ў ходзе ўрачыстага закрыцця конкурсу.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

## Добрая навіна

# МАБІЛЬНАЯ ПРАГРАМА «ДЗЯРЖІНСПЕКЦЫЯ» ЎЖО ДАЕ ПЛЁН

**Больш за тры тысячы чалавек за пяць дзён спампавалі мабільную праграму «Дзяржінспекцыя» з Play Маркет. Большасць карыстальнікаў пакуль тэсціруюць новы фармат паведамленняў, але паступаюць у дзяжурную службу Дзяржінспекцыі і сігналы, вартыя ўвагі.**

Першы з іх прыйшоў з Мазырскага раёна: карыстальнік адправіў фота з устаноўленымі пад лёд сеткамі. GPS-прывязка паказала, што здымак зроблены на затоцы Прыпяці каля вёскі Скрыгалаў. На месца правапарушэння выехала рэйдавая група з Мазыра. Лунку з сеткамі выявілі і прынялі рашэнне выняць іх з вады. Пад лёдам аказалася дзве сеткі даўжынёй каля 200 метраў. Амаль уся заблытаная ў іх рыба яшчэ была жывая, інспектары выпусцілі больш за 20 асобін.

Дапамогу мабільнай праграмы дзяржінспектары ацанілі спаўна. Сімвалічна, што першыя працаваць з ёй давялося супрацоўнікам Мазырскай міжрайінспекцыі, якая была прызнана найлепшай па выніках 2017 года. Нагадаем, праграма для смартфонаў «Дзяржінспекцыя» дазволіць паведамляць аб парушэннях прыродаахоўнага заканадаўства ў рэжыме анлайн. Любы, хто ўстановіць яе, зможа зафіксаваць парушэнне (рыбалоўства або паляванне забароненымі прыладамі, у забаронены час і г. д.) і пры наяўнасці інтэрнэту адправіць фота з апісаннем у дзяжурную службу Дзяржінспекцыі.

Перавага такога паведамлення ў тым, што разам з ім дзяжурная служба аўтаматычна атрымае і каардынаты пункта, дзе было зроблена фота. Мяркуецца, што пасля дапрацоўкі праграмы паведамленні будуць паступаць не толькі дзяжурнаму, але і на смартфоны супрацоўнікаў найбліжэйшай міжраённай інспекцыі. Пакуль праграма распрацавана для аперацыйнай сістэмы Android, плануецца таксама распрацоўка для iOS. Усім карыстальнікам гарантавана ананімнасць.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

## ОАО «Витебские ковры»
### ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО ОАО «ВИТЕБСКИЕ КОВРЫ»

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **Прядильные машины ПБ-114-Ш** | ЛОТЫ 1–14<br>Производитель – ф. «Текстильмаш», РФ.<br>Назначение – выработка одиночной аппаратной пряжи безбалонным способом прядения из шерстяных и химических волокон.<br>Бывшие в употреблении.<br>Рабочая ширина – 1350 мм, длина – 15880 мм. Число веретен на машине – 240 шт, диаметр кольца – 85 мм. Расстояние между веретенами 114 мм. Частота вращения веретен – 4000-7500 мин⁻¹ |
| Прядильная машина ПБ-114-Ш, инв. № 2764 | ЛОТ 1<br>Введена в эксплуатацию 07.09.2006.<br>Начальная цена продажи – 1700 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка –170 рублей |
| Прядильная машина ПБ-114-Ш, инв. № 1050 | ЛОТ 2<br>Введена в эксплуатацию 01.01.2001.<br>Начальная цена продажи – 1700 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка –170 рублей |
| Прядильная машина ПБ-114-Ш, инв. № 1182 | ЛОТ 3<br>Введена в эксплуатацию 01.01.2000.<br>Начальная цена продажи – 1700 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 170 рублей |
| Прядильная машина ПБ-114-Ш, инв. № 1181 | ЛОТ 4<br>Введена в эксплуатацию 01.01.2000.<br>Начальная цена продажи – 1700 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 170 рублей |
| Прядильная машина ПБ-114-Ш, инв. № 1180 | ЛОТ 5<br>Введена в эксплуатацию 01.12.1999.<br>Начальная цена продажи – 1700 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 170 рублей |
| Прядильная машина ПБ-114-Ш, инв. № 1124 | ЛОТ 6<br>Введена в эксплуатацию 02.01.2003.<br>Начальная цена продажи – 1700 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 170 рублей |
| Прядильная машина ПБ-114-Ш, инв. № 1534 | ЛОТ 7<br>Введена в эксплуатацию 02.03.2004.<br>Начальная цена продажи – 1700 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 170 рублей |
| Прядильная машина ПБ-114-Ш, инв. № 1533 | ЛОТ 8<br>Введена в эксплуатацию 05.07.2004.<br>Начальная цена продажи – 1700 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 170 рублей. |
| Прядильная машина ПБ-114-Ш, инв. № 1113 | ЛОТ 9<br>Введена в эксплуатацию 01.10.2001.<br>Начальная цена продажи – 1700 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 170 рублей |
| Прядильная машина ПБ-114-Ш, инв. № 1068 | ЛОТ 10<br>Введена в эксплуатацию 01.03.2001.<br>Начальная цена продажи – 1700 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 170 рублей |
| Прядильная машина ПБ-114-Ш, инв. № 1051 | ЛОТ 11<br>Введена в эксплуатацию 01.01.2001.<br>Начальная цена продажи – 1700 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 170 рублей |
| Прядильная машина ПБ-114-Ш, инв. № 1126 | ЛОТ 12<br>Введена в эксплуатацию 01.12.1998.<br>Начальная цена продажи – 1700 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 170 рублей. |
| Прядильная машина ПБ-114-Ш, инв. № 1127 | ЛОТ 13<br>Введена в эксплуатацию 01.12.1998.<br>Начальная цена продажи – 1700 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 170 рублей. |
| Прядильная машина ПБ-114-Ш, инв. № 1128 | ЛОТ 14<br>Введена в эксплуатацию 01.12.1999.<br>Начальная цена продажи – 1700 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 170 рублей |
| **Крутильные машины К-176-2** | ЛОТЫ 15–16<br>Производитель — Серпуховский механический завод.<br>Назначение – кручение пряжи номеров 2–5 из шерстяных, хим. волокон и их смесей в два и более сложений.<br>Бывшие в употреблении.Число веретен на машине – 148 шт. Расстояние между веретенами 176 мм. Скорость веретен – 2500-3200 м/мин, диаметр кольца – 140 мм |
| Крутильная машина К-176-2, инв. № 2854 | ЛОТ 15<br>Введена в эксплуатацию 20.08.2007.<br>Начальная цена продажи – 1474 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 147,40 рублей |
| Крутильная машина К-176-2, инв. № 1098 | ЛОТ 16<br>Введена в эксплуатацию 01.12.1965.<br>Начальная цена продажи – 1474 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 147,40 рублей |

## ОАО «Витебские ковры»
### ИЗВЕЩАЕТ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО ОАО «ВИТЕБСКИЕ КОВРЫ»

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| Прядильные машины ПБ-114-Ш | ЛОТЫ 1–2<br>Производитель — ОАО «Текстильмаш», РФ.<br>Назначение – выработка одиночной аппаратной пряжи безбалонным способом прядения из шерстяных и химических волокон.<br>Бывшие в употреблении.<br>Рабочая ширина – 1350 мм, длина – 15 880 мм. Число веретен на машине – 240 шт, диаметр кольца – 85 мм. Расстояние между веретенами 114 мм. Частота вращения веретен – 4000-7500 мин⁻¹ |
| Прядильная машина ПБ-114-Ш, инв. № 1116 | ЛОТ 1<br>Введена в эксплуатацию в 1998.<br>Начальная цена продажи – 1700 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 170 рублей |
| Прядильная машина ПБ-114-Ш, инв. № 1133 | ЛОТ 2<br>Введена в эксплуатацию в 1998.<br>Начальная цена продажи – 1700 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 170 рублей |
| **Концервальная машина КР-150-Ш, инв. №1066** | ЛОТ 3<br>Производитель — Пресненский машиностроительный завод, РФ. Назначение – разработка концов пряжи.<br>Бывшая в употреблении, введена в эксплуатацию в 2000 г.<br>Рабочая ширина машины – 1500 мм. Длина – 5030 мм.<br>Начальная цена продажи – 1680 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 168 рублей |
| **Обезрепеивающая машина О-120-ШМ2, инв. № 1242** | ЛОТ 4<br>Производитель — Пресненский машиностроительный завод, РФ.<br>Назначение – удаление из шерсти цепких растительных примесей механическим способом.<br>Бывшая в употреблении, введена в эксплуатацию в 1988 г.<br>Рабочая ширина машины — 1200 мм, диаметры рабочих органов: колковый барабан – 400 мм, бильный барабан – 500 мм, главный барабан – 580 мм, гребенной барабан – 700 мм.<br>Начальная цена продажи – 1920 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 192 рублей |
| **Чесальные аппараты CR-24** | ЛОТЫ 5-6<br>Производитель – ф. «Бефама», Польша.<br>Назначение – получение из смеси волокон сформированного однородного продукта в виде ровницы. Бывшие в употреблении, введены в эксплуатацию 01.01.2001.<br>Рабочая ширина – 1800 мм. Число прочесов – 3 |
| Чесальный аппарат CR-24, инв. № 1048 | ЛОТ 5<br>Начальная цена продажи – 3720 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 372 рублей |
| Чесальный аппарат CR-24, инв. № 1049 | ЛОТ 6<br>Начальная цена продажи – 3720 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 372 рублей |
| **Чесальные аппараты CR-643** | ЛОТЫ 7–8<br>Производитель – ф. «Бефама», Польша.<br>Назначение – получение из смеси волокон сформированного однородного продукта в виде ровницы. Бывшие в употреблении. Рабочая ширина – 2000 мм. Число прочесов – 3 |
| Чесальный аппарат CR-643, инв. № 1107 | ЛОТ 7<br>Введен в эксплуатацию 01.08.2001г.<br>Начальная цена продажи – 4440 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 444 рублей |
| Чесальный аппарат CR-643, инв. № 1188 | ЛОТ 8<br>Введена в эксплуатацию в 01.04.2002.<br>Начальная цена продажи – 4440 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 444 рублей |
| **Крутильная машина К-176-2, инв. № 1099** | ЛОТ 9<br>Производитель – Серпуховский механический завод, РФ.<br>Назначение – кручение одиночной пряжи в два и более сложений для достижения ровноты и прочности пряжи.<br>Бывшая в употреблении. Введена в эксплуатацию 01.12.1969.<br>Число веретен на машине – 160 шт. Расстояние между веретенами – 176 мм. Скорость веретен – 2500-3200 м/мин., диаметр кольца – 140 мм.<br>Начальная цена продажи – 1474 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка –147,40 рублей |
| **Механизированный лабаз правового исполнения ЛРМ-40П-Ш** | ЛОТЫ 10–17<br>Производитель – Пресненский машиностроительный завод, РФ.<br>Назначение – приемка и смешивание волокнистого материала, хранение, механизированная выгрузка через бункер на транспортер или в систему пневмотранспорта.<br>Бывшие в употреблении. Объем – 40 м³. Вместимость – 1400 кг. Ширина – 2250 мм, длина – 5650 мм, высота – 3610 мм. Масса – 10 900 кг |
| Механизированный лабаз правого исполнения ЛРМ-40П-Ш, инв. № 1137 | ЛОТ 10<br>Введен в эксплуатацию 01.12.1980.<br>Начальная цена продажи – 2100 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 210 рублей |
| Механизированный лабаз правого исполнения ЛРМ-40П-Ш, инв. № 1138 | ЛОТ 11<br>Введен в эксплуатацию 01.12.1980.<br>Начальная цена продажи – 2100 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 210 рублей |
| Механизированный лабаз правого исполнения ЛРМ-40П-Ш, инв. № 1139 | ЛОТ 12<br>Введен в эксплуатацию 01.12.1980.<br>Начальная цена продажи – 2100 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 210 рублей |
| Механизированный лабаз правого исполнения ЛРМ-40П-Ш, инв. № 1140 | ЛОТ 13<br>Введен в эксплуатацию 01.12.1980.<br>Начальная цена продажи – 2100 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 210 рублей |
| Механизированный лабаз правого исполнения ЛРМ-40П-Ш, инв. № 1144 | ЛОТ 14<br>Введен в эксплуатацию 01.12.1980.<br>Начальная цена продажи – 2100 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 210 рублей |
| Механизированный лабаз правого исполнения ЛРМ-40П-Ш, инв. № 1145 | ЛОТ 15<br>Введен в эксплуатацию 01.12.1980.<br>Начальная цена продажи – 2100 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 210 рублей |
| Механизированный лабаз правого исполнения ЛРМ-40П-Ш, инв. № 1149 | ЛОТ 16<br>Введен в эксплуатацию 01.12.1967.<br>Начальная цена продажи – 2100 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 210 рублей |
| Механизированный лабаз правого исполнения ЛРМ-40П-Ш, инв. № 1153 | ЛОТ 17<br>Введен в эксплуатацию 01.12.1998.<br>Начальная цена продажи – 2100 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 210 рублей |
| **Автоматический питатель самовесов чесальных аппаратов АПС-120-Ш** | ЛОТЫ 18–26<br>Производитель – Пресненский машиностроительный завод, РФ.<br>Назначение – подвесное автоматическое питание бункеров – самовесов чесальных аппаратов смесью через пневмотранспортер. Объем – 40 м³. Вместимость – 1400 кг. Ширина – 1000 мм, длина – 1300 мм, высота – 210 мм. Масса – 10 900 кг |
| Автоматический питатель самовесов чесальных аппаратов АПС-120-Ш, инв. № 1151 | ЛОТ 18<br>Введен в эксплуатацию 01.12.1962.<br>Начальная цена продажи – 1400 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 140 рублей |
| Автоматический питатель самовесов чесальных аппаратов АПС-120-Ш, инв. № 1152 | ЛОТ 19<br>Введен в эксплуатацию 01.12.1962.<br>Начальная цена продажи – 1400 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 140 рублей |
| Автоматический питатель самовесов чесальных аппаратов АПС-120-Ш, инв. № 1154 | ЛОТ 20<br>Введен в эксплуатацию 01.12.1967.<br>Начальная цена продажи – 1400 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 140 рублей |
| Автоматический питатель самовесов чесальных аппаратов АПС-120-Ш, инв. № 1155 | ЛОТ 21<br>Введен в эксплуатацию 01.12.1967.<br>Начальная цена продажи – 1400 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 140 рублей |
| Автоматический питатель самовесов чесальных аппаратов АПС-120-Ш, инв. № 1156 | ЛОТ 22<br>Введен в эксплуатацию 01.12.1967.<br>Начальная цена продажи – 1400 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 140 рублей |
| Автоматический питатель самовесов чесальных аппаратов АПС-120-Ш, инв. № 1158 | ЛОТ 23<br>Введен в эксплуатацию 01.12.1967.<br>Начальная цена продажи – 1400 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 140 рублей |
| Автоматический питатель самовесов чесальных аппаратов АПС-120-Ш, инв. № 1159 | ЛОТ 24<br>Введен в эксплуатацию 01.12.1967.<br>Начальная цена продажи – 1400 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 140 рублей |
| Автоматический питатель самовесов чесальных аппаратов АПС-120-Ш, инв. № 1161 | ЛОТ 25<br>Введен в эксплуатацию 01.12.1967.<br>Начальная цена продажи – 1400 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 140 рублей |
| Автоматический питатель самовесов чесальных аппаратов АПС-120-Ш, инв. № 1163 | ЛОТ 26<br>Введен в эксплуатацию 01.12.1967.<br>Начальная цена продажи – 1400 рублей без учета НДС.<br>Сумма задатка – 140 рублей |

## ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ДВУХ АУКЦИОНОВ

| | |
|---|---|
| **Местонахождение объектов** | Витебская обл., г. Витебск, ул. М. Горького, 75 |
| **Шаг аукциона** | 5 % |
